

КРАМЫ Ў ВЁСКАХ ЗАХАВАЦЬ ЦІ ЗАКРЫВАЦЬ? МС

ЦЁПЛЫЯ КАДРЫ Ў... МІНУС 49

19



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родны мове

# ЗВЯЗДА

5 ЛЮТАГА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 22 (29391)

+TV ПРАГРАМА МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ХМЕЛЬ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Комплекс мер па падрыхтоўцы аб'ектаў ЖКГ да работы ў асенне-зімовы перыяд дазволіў захаваць устойлівае функцыянаванне сістэм жыццезабеспячэння насельніцтва, надзвычайных сітуацый не было зафіксавана. Разам з тым з пачатку бягучага года на аб'ектах сістэмы ЖКГ адбылася 131 аварыя. З цяперашняга часу ўсе аварыйныя сітуацыі будуць дэталёва разглядацца ў Мінжылкамгасе. Прычыны ўзнікнення аварый таксама будуць старанна аналізавацца. І пры распрацоўцы праграмы падрыхтоўкі да наступнага асенне-зімовага перыяду ўсе гэтыя нюансы трэба ўлічыць».*

# Насуперак завеі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Учора сталіцу, як і ўсю Беларусь, літаральна засыпала снегам. На ачыстку вуліц і тратуараў Мінска выйшла каля 630 адзінак тэхнікі і каля 700 чалавек. Дарожныя службы працавалі ў кругласутачным рэжыме.

## КОРАТКА

- Снегапад у Гродне перасягнуў рэкорд 50-гадовай даўніны.
- **Зацверджана дзяржпраграма «Культура Беларусі» да 2025 года з фінансаваннем Br4 млрд.**
- Стацыянарная сетка сейсмічных назіранняў будзе працаваць у раёне БелАЭС.
- **Прыватныя лабараторыі змогуць праводзіць ПЛР-даследаванні на SARS-CoV-2 для сістэмы аховы здароўя.**
- «Белавія» аднаўляе палёты ў Санкт-Пецярбург з 12 лютага, у Растоў-на-Доне — з 13 лютага.

ISSN 1990 — 763X

21022

Перспектыва

# ТРАЕКТОРЫЯ РАЗВІЦЦЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ

Аб тым, што плануецца зрабіць на поўначы краіны, «Звяздзе» расказаў першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег МАЦКЕВІЧ

***— Нядаўна старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў, выступаючы перад дэлегатамі VI Усебеларускага народнага сходу, агучыў вынікі работы ў мінулым годзе і пяцігодцы. Чым можна ганарыцца?***



— Галоўны вынік пяцігодкі — рост даходаў насельніцтва. Рэальная заработная плата вырасла прыкладна ў 1,2 раза. На рынку працы захавана стабільная сітуацыя, не дапушчаны рост узроўню беспрацоўя: на сёння яно менш 1 %. На новыя рабочыя месцы за кошт стварэння новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў працаўладкавана больш за 25 тысяч чалавек, заданне перавыканана на 13 %. А ўсяго за пяць гадоў працаўладкавалі больш чым 30,5 тысячы чалавек.

СТАР. 5

Тэхналогіі

# Біткоін выходзіць з «шэрай» зоны?

Гэта сапраўды так, але наперадзе яшчэ шмат чаго новага...

**Аб перспектывах развіцця дадзенай віртуальнай валюты і рэальнай сітуацыі ў галіне крыптавалют у нашай краіне расказвае Вячаслаў СЕНІН, эксперт рынку і дырэктар правайдара электронных плацяжоў Assist Belarus, які выступіў адным з распрацоўшчыкаў першага ў Беларусі сэрвісу па абмене крыптавалют whitebird.io.**

***— Вячаслаў, для пачатку давайце разбяромся, чаму крыптавалюта становіцца ўсё больш папулярнай і ці з'яўляецца яна легальнай у нашай краіне?***

— Прайшло менш чым дзесяць гадоў пасля стварэння першай крыптавалюты, і нікому не вядомыя віртуальныя грошы сёння набылі неверагодную папулярнасць. З 2017 года ў свеце пачаўся сапраўдны бум па выкарыстанні «біткоў». У ЗША, Канадзе, Швецыі і яшчэ больш чым дзесяці краінах свету лічбавыя актывы ўжо выкарыстоўваюць ва ўсіх сферах жыцця.

У краінах СНД большасць крыптаабменнікаў да гэтага часу знаходзіцца ў цяні, і іх уладальнікі пракручваюць мільярдныя здзелкі. За апошнія некалькі гадоў лічбавыя актывы імкліва набіраюць папулярнасць. Перш за ўсё гэта звязана з іх універсальнасцю. Кашалёк лёгка ствараецца практычна на любой лічбавай прыладзе, няхай гэта будзе камп'ютар або тэлефон, а адкрытасць разліковых аперацый робіць яго зручным і простым у выкарыстанні. Блакаванне кашалькоў выключаецца, паколькі ўсе вузлы сістэмы генерацыі з'яўляюцца раўнапраўнымі.

СТАР. 6

# Прагрэс з зачынам на перспектыву

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з паслом Узбекістана Насірджанам Юсупавым з нагоды заканчэння яго місіі

**«Вы яшчэ паслужыце не толькі Беларусі, але і сваёй Радзіме, роднаму і выдатнейшаму Узбекістану. Я хачу вам падзякаваць за ўсё тое, што вы зрабілі на пасадзе пасла вельмі блізкай і дружалюбнай нам краіны», — звярнуўся Прэзідэнт да кіраўніка дыппрадстаўніцтва.**

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, усё, што зроблена паміж краінамі, значны прагрэс у развіцці двухбаковых адносін звязаны з дзеючым Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым. «Тое, што ён пачаў рабіць пасля пэўнага перыяду развіцця незалежнага Узбекістана, заўтра будзе бачна ў станоўчым ключы. Я нават пабойваюся часам, калі пачынаю з ім размаўляць аб планах Узбекістана: ці не занадта рэзка ён узяўся за ўсё? Пакуль атрымліваецца», — сцвярджае кіраўнік краіны.

Паводле яго слоў, кіраўніку Узбекістана прыйшлося хутка перадольваць тое, што было ўпушчана ў развіцці краіны. Пры тым, такая значная рэспубліка, як Узбекістан, не можа быць незаўважнай для іншых дзяржаў.

«Узбекістан — краіна з 35 мільёнамі насельніцтва. Вельмі насычаная краіна з вялікімі праблемамі, у тым ліку рэлігійнымі і іншымі, што дасталіся ў спадчыну. Яна не можа быць не ў полі зроку іншых дзяржаў, моцных гэтага свету. Пакуль магчыма на далёкіх прыступках, а потым усё бліжэй яна будзе сутыкацца з гэтымі праблемамі. Але я ўпэўнены: з такім Прэзідэнтам вы з гэтымі праблемамі справіцеся», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі заўважыў: ведае, што пасол Насірджан Юсупаў падтрымлівае курс дзеючага кіраўніка Узбекістана, і ў гэтым іх падабенства з Аляксандрам Лукашэнкам.

«Буду вельмі спадзявацца, што скончыўшы сваю місію ў Беларусі, вы яшчэ вялікую карысць прынесяце на іншых пасадах і для Беларусі. Нават, калі вы нідзе не будзеце працаваць, я думаю, самыя добрыя ўражанні, што ў вас застануцца ад Беларусі, заўсёды будуць над вамі вісець у добрым сэнсе гэтага слова», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да Насірджана Юсупава. Той у адказ падзякаваў кіраўніку краіны за прыемныя словы і адзначыў, што тры гады яго працы ў Беларусі праляцелі вельмі хутка. Ён падкрэсліў, што ў свой час запрашэнне на пасаду кіраўніка дыпмісіі Узбекістана ў Мінску ацаніў як вялікі давер і гонар.

Пасол назваў самае значнае, на яго думку, дасягненне ў беларускаўзбекскай дыпламатыі. «Ужо ёсць нейкія паказчыкі, але не толькі па лічбах пра гэта можна меркаваць. У перспектыве гэтыя лічбы будуць больш важкія. Мы стварылі зачын, але самае галоўнае, я лічу, — нам удалося дабіцца, што ў Беларусі больш ведаюць пра Узбекістан, а ва Узбекістане — пра Беларусь», — сказаў Насірджан Юсупаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Парламенцкі дзённік

# Кодэкс аб адукацыі, абарона персанальных даных і эканоміка

## У ніжняй палаце абмеркавалі план работы на вясну

**«Работа Палаты прадстаўнікоў павінна быць нацэленая на захаванне міру, бяспекі, нашых каштоўнасцяў і традыцый, забеспячэнне грамадзянскай згоды і адзінства, належнай якасці жыцця людзей», — звярнуўся на пасяджэнні Савета да калег старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

Ён выказаў упэўненасць у тым, што вынікі Усебеларускага народнага сходу ў многім будуць фарміраваць парадак дня заканадаўчай дзейнасці ніжняй палаты парламента і на найбліжэйшы год, і на перспектыву ў цэлым.

Гаворачы пра законапраекты вясновай сесіі, спікер асобна адзначыў карэкціроўку Кодэкса аб адукацыі, праект якой ужо знаходзіцца ў дэпутатаў.

«Эфектыўная сістэма адукацыі непасрэдна ўплывае на грамадзянскую свядомасць падлеткаў, моладзі, развіццё чалавечага капіталу, садзейнічае эканамічнаму росту краіны. Таму трэба падрыхтаваць комплексны, выверany дакумент, які здольны забяспечыць баланс інтарэсаў педагогаў, вучняў і бацькоў», — сказаў ён і напомніў пра неабходнасць шырокага абмеркавання законапраекта ў грамадстве.

На чэрвень запланаваныя парламенцкія слуханні на гэту тэму.

У вясновую сесію павінна быць завершана работа над законапраектам «Аб дзяржаўнай службе», які ў снежні прайшоў першае чытанне. Уладзімір Андрэйчанка папрасіў падключыцца да работы над гэтым дакументам усіх дэпутатаў, абмеркаваць яго ў сваіх выбарчых акругах з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Шэраг заканадаўчых рашэнняў трэба будзе прыняць, каб, па даручэнні кіраўніка дзяржавы, папярэдзіць магчымыя пагрозы ў парушэнні закона, паведаміў старшыня Палаты прадстаўнікоў. Размова пра законапраекты «Аб абароне персанальных даных» (прыняты ў першым чытанні), «Аб недапушчэнні геразацыі нацызму», «Аб змяненні крымінальнага, крымінальна-выканаўчага заканадаўства» і іншыя.

Дэпутаты ініцыявалі карэкціроўку закона «Аб рэспубліканскіх і мясцовых сходах», і гэту работу таксама трэба завяршыць у найбліжэйшую сесію, дадаў спікер.

У найбліжэйшыя месяцы ў Палату прадстаўнікоў паступіць блок важных дакументаў у эканамічнай сферы: праекты змяненняў у Банкаўскі кодэкс і законы аб рынку каштоўных папер, аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання, аб ліцэнзаванні, аб інвестыцыях, аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве. Яны павінны быць разгледжаныя праз прызму праграмных дакументаў на будучую пяцігодку, адзначыў спікер.

У першым паўгоддзі ў ніжняй палаце парламента запланавана каля 30 семінараў, у тым ліку шэраг — у рамках Года народнага адзінства. «Усе яны павінны быць дасканала падрыхтаваныя і безумоўна, самае галоўнае — мець рэальны практычны вынік, — звярнуў увагу Уладзімір Андрэйчанка. — Гэта прапановы па карэкціроўцы заканадаўства, забеспячэнні патрыятычнага выхавання, падняцці ўзроўню прававой і палітычнай культуры грамадзян».

На Савеце быў разгледжаны і план міжнароднага супрацоўніцтва Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на 2021 год.

«Беларусь прадоўжыць актыўную работу з міжнароднымі парламенцкімі арганізацыямі, у якіх наша рэспубліка з'яўляецца паўнапраўным членам. Гэта Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі, МПА СНД, парламенцкія асамблеі АБСЕ, АДКБ, Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы, — сказаў журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ.** — Прадоўжыцца актыўнае супрацоўніцтва па лініі двухбаковых сувязяў з парламентамі замежных краін».

Такая работа будзе весціся як у анлайн-фармаце, так і ў рэжыме жывых зносін. Сёлета плануюцца візіты парламенцкай дэлегацыі Беларусі ў Егіпет і Сербію. Чакаецца, што Мінск наведаюць парламентарыі з Малдовы, Аўстрыі і Швейцарыі. У планах Палаты прадстаўнікоў правесці спецыялізаваныя нарады з удзелам зацікаўленых ведамстваў і экспертаў, дзелавых колаў наконт узаемадзеяння з рознымі рэгіёнамі (Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і г. д.) па канкрэтных кірунках эканомікі, развіцця рэгіёнаў і іншых.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Ва ўрадзе

# Новае свята і яшчэ 105 пунктаў

**Савет Міністраў Беларусі зацвердзіў рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні Года народнага адзінства. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 2 лютага № 64, паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу беларускага ўрада.**

У спіс мерапрыемстваў уключылі 106 пунктаў. Сярод іх — рэалізацыя рашэнняў VI Усебеларускага народнага сходу, правядзенне мерапрыемстваў, прымеркаваных да знакавых падзей у гісторыі Беларусі, і якія маюць асаблівае гістарычнае і грамадска-палітычнае значэнне (Дзень Канстытуцыі 15 сакавіка, Свята працы 1 мая, Дзень Перамогі 9 мая, Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга, Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны 22 чэрвеня, Дзень Незалежнасці 3 ліпеня і іншыя), аўтамотавелапрабег, прысвечаны Году народнага адзінства.

Да 1 сакавіка прапрацуюць пытанне аб устанаўленні ў Беларусі дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства. Будзе падрыхтаваны праект закона, накіраванага на супрацьдзеянне рэабілітацыі нацызму, герaізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых.

У планах стварэнне інфармрэсурсу «Народная згода» і тэлеграм-канала, прысвечанага Году народнага адзінства, правядзенне сацыялагічных даследаванняў «Народнае адзінства як фактар умацавання беларускай дзяржавы». Чыноўнікі хочуць больш актыўна знаёміць моладзь з дасягненнямі Беларусі ў сацыяльна-эканамічнай, навуковай, спартыўнай, культурнай сферах. Для гэтага арганізуюць сустрэчы, канферэнцыі, інтэрнэт-форумы з удзелам прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, работнікаў розных галін эканомікі і сацыяльнай сферы, ветэранаў вайны і працы. Будуць распрацаваны метадычныя рэкамендацыі для ўстаноў адукацыі па фарміраванні веданў і паважлівага стаўлення да дзяржаўных сімвалаў Беларусі.

Запланавана ўсебеларуская маладзёжная экспедыцыя «Маршрутамі памяці. Маршрутамі адзінства», рэспубліканскія конкурсы сярод моладзі на найлепшы медыярэсурс патрыятычнай тэматыкі, праект «Гродна — маладзёжная сталіца Рэспублікі Беларусь 2021», інфармацыйна-адукацыйны праект «ШАГ», нацыянальны дзіцячы форум «Беларусь — краіна магчымасцяў!», правядзенне ваенна-патрыятычных лагераў для моладзі. Улады таксама хочуць павысіць прававую кампетэнцыю і прававую культуру дзяцей і моладзі.

Падчас валанцёрскіх акцый будуць дапамагаць адзінокім ветэранам, інвалідам, пажылым грамадзянам, дапамогу павінны атрымаць тыя, хто мае патрэбу ў дарагім лячэнні.

У пералік мерапрыемстваў уключана работа дыялогавых пляцовак, круглых сталоў, адкрытыя дыялогі з удзелам прадстаўнікоў зарэгістраваных грамадскіх арганізацый і палітычных партый па актуальных пытаннях развіцця краіны і рэгіёнаў, стварэнне саветаў старэйшын пры мясцовых выканаўчых і распарадчых органах. Запланаваны сустрэчы з вядомымі людзьмі, якія нарадзіліся ў вобласці, раёне і сталі вядомымі людзьмі Беларусі, аб'яднаныя ў цыкл «Жыццё на карысць Радзімы».

Сярод мерапрыемстваў таксама круглы стол «Стварэнне беларускамоўнай заканадаўчай базы як фактар гарманічнага развіцця грамадства» і правядзенне мерапрыемстваў, прымеркаваных да Міжнароднага дня роднай мовы.

У плане прапісана ўзаемадзеянне з прадстаўнікамі рэлігійных канфесій па фарміраванні ў грамадстве нецярпімасці да праяў экстрэмізму, нацызму і ўсіх формаў гвалту, правядзенне ўсебеларускай малітвы «За Беларусь!».

Урад хоча выкарыстаць патэнцыял прадстаўнікоў беларускай дыяспары і грамадзян замежных краін у развіцці двухбаковых адносін у гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах, супрацьдзеянні дэзінфармацыйным кампаніям супраць Беларусі.

Для бізнесу арганізуюць «адкрытыя прыёмныя» па абмеркаванні актуальных і праблемных пытанняў развіцця суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, будзе падтрымлівацца стартап-рух.

У Год народнага адзінства хочуць правесці першы форум паспяховых бацькаў і маці, кангрэс жанчын, шэраг спартыўна-масавых і фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў, мерапрыемстваў для развіцця медыяадукаванасці і медыябяспекі. Частка мерапрыемстваў будзе прысвечана добраўпарадкаванню населеных пунктаў.

Блізкая ўлада

# Аблвыканкам слухае!

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 6 лютага, з 9.00 да 12.00 праведуць:

• першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валерый Васілевіч РЭБКАВЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатольеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Факт

# БЕЛАРУСКАМУ ПРЭЗІДЭНТУ ВА УКРАІНЕ ДАВЯРАЮЦЬ БОЛЬШ, ЧЫМ УЛАСНАМУ

**Днямі былі агучаны вынікі апытання, якое з 27 студзеня да 1 лютага было праведзена Кіеўскім міжнародным інстытутам сацыялогіі (КМІС). У ім узялі ўдзел 1205 рэспандэнтаў, якія пражываюць у 86 населеных пунктах усіх рэгіёнаў Украіны. Апытанне праводзілася шляхам асабістага інтэрв'ю з выкарыстаннем планшэтаў (CAPPE).**

Спектр пытанняў, якія задаваліся рэспандэнтам, быў даволі шырокі. Спецыялісты імкнуліся ахапіць як мага больш шырокі пласт грамадскай думкі, што датычыўся пераваг украінцаў па шэрагу актуальных пытанняў. Сярод тэм, якія абмяркоўваліся падчас правядзення сацыялагічнага апытання, — платнасць супраць павышэння тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі. Як вынікае з прэс-рэліза Кіеўскага міжнароднага інстытута сацыялогіі, падтрымлівае акцыі большасць рэспандэнтаў — звыш 91 працэнта.

Таксама задавалася і пытанне накont таго, якой мовай карыстаюцца апытаныя дома. Аказалася, што прыкладна аднолькавыя групы выкарыстоўваюць украінскую і рускую — адпаведна 38,8 і 36,4 працэнта.

Важным складнікам сацыялагічнага даследавання стаў спектр палітычных пытанняў. У прыватнасці, высветлілася, што большасць рэспандэнтаў — 55,4 працэнта — падтрымлівае адстаўку цяперашняга Кабінета міністраў (дарэчы, прэм'ер-міністру Дзянісу Шмыгалю давярае 11,2 працэнта). 60,8 працэнта апытаных выступае за роспуск Вярхоўнай рады і правядзенне пазачарговых парламенцкіх выбараў. Дарэчы, у лідары пераваг украінцаў выйшла партыя «Апазіцыйная платформа — За жыццё» (АПЗЖ) — 24,1 працэнта. «Слуга народа» на другім месцы з 18,2 %. Замыкае тройку лідараў электаральных пераваг «Еўрапейская салідарнасць» (ЕС) з 15,6 працэнта падтрымкі. Адметна, што ў параўнанні з аналагічным апытаннем, якое было праведзена ў канцы мінулага года, і АПЗЖ, і ЕС свае рэйтынгі павялічылі, а «Слуга народа» панізіў.

Адстаўку прэзідэнта і правядзенне выбараў кіраўніка дзяржавы падтрымлівае 47,5 працэнта апытаных Кіеўскім міжнародным інстытутам сацыялогіі. Цікава выглядае рэйтынг украінскіх палітыкаў. Больш за ўсё рэспандэнтаў заявіла, што давяраюць мэру Кіева Віталю Клічко — 37,5 працэнта, дзеючаму прэзідэнту Уладзіміру Зяленскаму — 35,6 %, экс-прэм'еру Уладзіміру Гройсману — 30,9 %, дэпутату Юрыю Бойку — 28,9 %, палітыку і шоўмену Сяргею Прытуле — 27,3 %.

Вызначаны і перавагі ўкраінцаў наконт замежных палітыкаў. «Рэйтынг даверу ўкраінцаў узначаліў Лукашэнка», — пад такім загалоўкам абвясціла пра топ-навіну gazeta.ua. Пра гэта паведамілі ўкраінскія, расійскія, а таксама шэраг іншых медыйных рэсурсаў. Аб сваім даверы да беларускага лідара выказалася 36 працэнтаў украінцаў (між іншым, гэта больш, чым да Уладзіміра Зяленскага). Цікава, што рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі ва Украіне вырас у параўнанні з вынікамі адпаведнага апытання, якое праводзіў КМІС у верасні мінулага года, амаль на 5 працэнтаў.

Беларускі лідар па рэйтынгу даверу ўкраінцаў амаль на 10 працэнтаў абышоў прэзідэнта ЗША Джо Байдэна, які набраў 26,7 % пераваг рэспандэнтаў. Кіраўніку Францыі Эмануэлю Макрону давярае прыкладна столькі ж — 26,2 працэнта. Адметна, што апошняга не ведаюць 27,6 працэнта апытаных. З Байдэнам «незнаёмыя» 24,6 працэнта рэспандэнтаў. Як той казаў, каментарыі тут залішнія.

**Пётр ДУНЬКО.**

На слыху

# НОВЫХ ШТАМАЎ КАРАНАВІРУСА Ў НАС ПАКУЛЬ НЯМА

**Беларускія вучоныя не выявілі новых варыянты каранавіруса ў тых, хто прыязджае з-за мяжы. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства аховы здароўя.**

На базе РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі арганізавана сістэма маніторынгу распаўсюджання муціруючых варыянтаў віруса SARS-CoV-2. Праводзіцца збор і даследаванне матэрыялаў ад асоб, якія на працягу апошніх 14 дзён прыбылі з-за мяжы Беларусі і маюць станоўчы ПЛР-тэст. Улічваючы, што вірус мае здольнасць да пастаяннай і прадукцыйнай зменлівасці, важна хутка выяўляць яго новыя варыянты. Для гэтага ў Беларусі адпрацавана методыка секвеніравання S-гена віруса, з якім звязаны асноўныя мутацыі, выяўленыя ў новых варыянтах віруса (брытанскі, амерыканскі, японскі). На сёння беларускія вучоныя новых варыянтаў у беларусаў, якія вярнуліся з-за мяжы, не выявілі.

Як нагадвае Міністэрства аховы здароўя, у снежні 2020 года ў Вялікабрытаніі стаў актыўна распаўсюджвацца новы «брытанскі» варыянт каранавіруса, які больш эфектыўна перадаецца ў параўнанні і з зыходным варыянтам, і з тым, што нясе мутацыю D614G. Яго распаўсюджанне можа значна паўплываць на развіццё эпідэміі ў будучым.

Вірус, вылучаны ў ПАР у снежні 2020 года, таксама мае падобныя з «брытанскім» варыянтам мутацыі і з'яўляецца больш «заразным» у параўнанні з «брытанскім». Найбольш часта сустракаецца ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы і Вялікабрытаніі, далей з вялікім адрывам ідуць Германія, Аўстралія, Францыя, Бельгія. Спецыфічныя антыцелы да папярэдніх варыянтаў віруса маюць менш эфектыўную вірусанейтралізуючую актыўнасць да згаданага варыянта. У сувязі з гэтым магчымая рызыка паўторнага заражэння ў першую чаргу ў імунакампраметаваных асоб. У студзені




2021 года японскія даследчыкі апісалі варыянт віруса, завезены з Бразіліі ў Японію, падобны да «паўднёваафрыканскага» па наборы наяўных мутацый. Маюцца асобныя паведамленні аб новых значных мутацыях геному віруса, выяўленых у Германіі (Баварыя) і Партугаліі.

Па меры развіцця пандэміі COVID-19 узбуджальнік — вірус SARS-CoV-2 — пастаянна эвалюцыянуе. Да мая—чэрвеня 2020 года змяненні геному былі адносна нязначныя. Выключэнне — мутацыя D614G, штам-носьбіт якой хутка распаўсюдзіўся ў Еўропе і ЗША. Вірус, які мае такую мутацыю, больш эфектыўна заражае клеткі ў параўнанні з зыходным, зафіксаваным у Кітаі ў снежні 2019 года — студзені 2020 года.

**Алена КРАВЕЦ.**

Надвор'е

# Пасля снежнага «Зігберта» — сапраўдныя маразы

**Гэтымі днямі на паўднёвыя раёны Беларусі выйшаў цыклон, які атрымаў у нямецкіх сіноптыкаў імя «Зігберт» — менавіта ён прынёс у нашу краіну добрую порцыю снегу. Па меры прасоўвання цыклону ва ўсходнім напрамку ў нашу краіну пачне паступаць халодная няўстойлівая паветраная маса з паўночнага захаду. У гэты час тэмпературны фон пачне паніжацца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А сёння ўдзень будзе воблачна з праясненнямі. У многіх раёнах пройдзе невялікі снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, заходні ўмераны, па паўднёвым усходзе месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра будзе ад мінус 4 да 10 градусаў ніжэй за нуль.

У выхадныя чакаецца далейшае ўзмацненне маразоў. У суботу ўначы і раніцай месцамі па краіне пройдзе невялікі кароткачасовы снег, удзень будзе пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 13—18 марозу, месцамі — да мінус 20 градусаў, па поўдні краіны — мінус 10—12 градусаў. Удзень будзе 7—14 градусаў ніжэй за нуль.

У нядзелю будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па Брэсцкай вобласці пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца няўстойлівы слабы, удзень у паўднёва-заходніх раёнах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 15—22 марозу, месцамі — да мінус 23—25 градусаў. Удзень таксама будзе злёгку «кусаць за вушы» — мінус 7—14 градусаў ніжэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на пачатку наступнага тыдня захаваецца падобнае марознае надвор'е.

**А цяпер некалькі слоў аб мінулым студзені.** У другім месяцы зімы ў сярэднім па краіне выпала 73,2 мм ападкаў, што складае 183 % кліматычнай нормы. Па ўсёй тэрыторыі краіны за месяц выпала 1,5—2 нормы. Ападкі былі ў выглядзе дажджу, снегу і мокрага снегу. Вышыня снежнага покрыва на апошні дзень месяца знаходзілася ў межах ад 5 см да 44 см.

Сярэдняя па Беларусі тэмпература паветра ў студзені склала мінус 4,1 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 0,3 градуса. Тэмпературны рэжым на працягу месяца быў неаднародны. Вельмі цёплымі былі першая і трэцяя дэкады з сярэдняй тэмпературай паветра на 3,8 і 4 градусы вышэй за норму адпаведна. Другая дэкада была вельмі халодная (на 7 градусаў ніжэй за норму).

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэзідэнт Паўднёвай Карэі заклікаў кампаніі, якія выйгралі ад пандэміі, падзяліцца прыбыткам



Кажучы пра нераўнамернае аднаўленне эканомікі пасля пандэміі, Мун Чжэ Ін у чарговы раз заклікаў кампаніі, што зарабілі на каранавіруснай пандэміі, падзяліцца часткай прыбытку з невялікімі фірмамі, якім давялося ўзяць на сябе галоўную долю страт. Прэзідэнт і яго прыхільнікі разлічваюць заканадаўча аформіць сваю ініцыятыву. Буйны бізнес, па плане Муна, будзе добраахвотна ўносіць грошы ў спецыяльны фонд, са сродкаў якога пачне аказвацца дапамога дробным прадпрыемствам, якія асабліва ўразлівыя перад крызісамі і ўзрушэннямі. Ідэя дзяліцца прыбыткам уваходзіць ва ўсёабдымную стратэгію росту, пра якую Мун Чжэ Ін расказаў на мінулым тыдні на форуме ў Давосе. «Калі ўвасобіць яе ў жыццё, — сказаў прэзідэнт Паўднёвай Карэі, — то гэтая ўсёабдымная мадэль можа ў будучым дапамагчы перамагчы новыя эпідэміі накшталт каранавіруса».

## У Кітаі колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў наблізілася да мільярда чалавек




У канцы мінулага года ў Паднябеснай колькасць карыстальнікаў інтэрнэту дасягнула 989 мільёнаў чалавек. Аб гэтым паведаміла інфармагенцтва «Сіньхуа», спасылаючыся на звесткі Кітайскага цэнтра сеткавай інфармацыі (КЦСІ). Пры гэтым даступнасць інтэрнэту ўзрасла на 5,9 працэнтных пункта — да 70,4 % у перыяд самаізаляцыі, распавялі спецыялісты КЦСІ, які адказвае за размеркаванне IP-адрасоў і даменаў кітайскай зоны. Арганізацыя ўдакладняе, што да канца 2020 года ў КНР, у параўнанні з сакавіком таго ж года, колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў у краіне павялічылася на 85,4 млн. Пры гэтым 986 млн жыхароў Кітая, або 99,7 % ад агульнай колькасці карыстальнікаў, выходзяць у інтэрнэт з мабільных тэлефонаў.

## У Егіпце знайшлі муміі з залатымі языкамі



Міністэрства па справах старажытнасцяў Егіпта паведаміла пра знаходку мумій узростам дзве тысячы гадоў, у роце якіх знаходзіліся залатыя языкі. Артэфакты выяўленыя міжнароднай камандай археолагаў падчас раскопак 16 каменных магільняў у александрыйскім храме Тапасірыс-Магна, які быў папулярным месцам пахаванняў у грэчаскі і рымскі перыяды. Самі муміі практычна не захаваліся, аднак у некаторых з іх у роце былі выяўленыя амулеты з залатой фольгі ў форме языкоў. Старажытныя егіпцяне лічылі, што гэта дапамагала мёртвым паўстаць перад судом уладара замагільнага царства, бога Асірыса.




Прыярытэты

# Сям'я, здароўе, жыллё і адукацыя

**У цэнтры асноўных палажэнняў праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі — чалавек і якасць яго жыцця. Пра гэта заявілі спікеры падчас спецыяльнай прэс-канферэнцыі, прысвечанай азначанай тэме.**

«Асновы чалавечага патэнцыялу і асобы закладваюцца ў сям'і, таму натуральна, што і прыярытэтам у праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця будзе шчаслівая сям'я, — лічыць **начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА.** — Асаблівая ўвага павінна аддавацца шматдзетным сем'ям».

Спецыяліст адзначыла, што такая эфектыўная мера, як сямейны капітал, будзе развівацца і далей. У прыватнасці, прапануецца выкарыстоўваць сямейны капітал на пагашэнне запазычанасці па крэдыце грамадзян, якія самастойна заключылі дагавор на будаўніцтва жылля, на пагашэнне пазык, якія выдаюцца па месцы працы грамадзян на набыццё долі ва ўласнасці, ці набыццё жылля не па месцы пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу. У сферы аховы здароўя сямейны капітал можна будзе накіраваць на набыццё артапедычных вырабаў і тэхнічных сродкаў рэабілітацыі. А вось у сферы адукацыі будуць пашыраны катэгорыі ўстаноў, пры навучанні ў якіх таксама можна будзе яго выкарыстоўваць.

«Нам вельмі важна стварыць асяроддзе, дружалюбнае да сям'і, і для гэтага трэба гарманізаваць баланс «сям'я—работа», — дадала Марына Арцёменка.— Неабходны такія ўмовы, каб нараджэнне дзіцяці не змяняла звыклы ўклад жыцця сям'і, таму мы будзем развіваць гнуткія графікі работы, работу дыстанцыйную і на «аддаленцы». Для гэтага сёлета запланавана карэкціроўка Працоўнага кодэкса».

**Намеснік дырэктара па педыятрыі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Алена УЛЕЗКА** адзначыла, што задача медыкаў — каб сем'і былі здаровыя. У гэтым кірунку дзяржава ўжо і так зрабіла многае. Напрыклад, у медустановах аказваецца бясплатная медыцынская дапамога, бясплатна забяспечваюцца лекавымі сродкамі дзеці да трох гадоў, дзеці-інваліды да 18 гадоў, бясплатная першая спроба ЭКА. Планамерная работа па ахове мацярынства і дзяцінства дала свае вынікі: на працягу апошніх 20 гадоў узровень мацярынскай смяротнасці знізіўся ў 10 разоў, па паказчыку дзіцячай смяротнасці Беларусь апярэджвае ўсе краіны СНД. Па ўсёй Беларусі працуюць 38 Цэнтраў ранняга ўмяшання, мэтай якіх з'яўляецца ранняе выяўленне парушэнняў развіцця і арганізацыя своечасовай медыцынскай міждысцыплінарнай дапамогі як дарослым, так і дзецям. Аддаецца вялікая ўвага рэпрадуктыўнаму здароўю падлеткаў, для гэтага функцыянуе 54 Цэнтры, дружалюбныя падлетку, у розных рэгіёнах.

«Ва ўмовах падзення нараджальнасці наша задача забяспечыць рэпрадуктыўнае здароўе мужчын і жанчын і стварыць умовы для нараджэння здаровых дзяцей», — падкрэсліла Алена Улезка.

Аб развіцці краіны ў кантэксце моцных рэгіёнаў расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь Уладзіслаў ШАПАВАЛАЎ:** «Плануецца выдзяленне пад забудову ўчасткаў з ужо падведзенай інжынерна-транспартнай інфраструктурай. Комплексная забудова будзе ажыццяўляцца адным забудоўшчыкам, дзякуючы гэтаму мы зможам мець адзінае архітэктурнае аблічча і такім чынам выключыць дамы-даўгабуды».

Таксама ў будучай пяцігодцы грамадзянам будуць выдзяляць бязвыплатна нявыкарыстаныя зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылля ў неперспектыўных вёсках. Праўда, будзе ўмова: навесці парадак на ўчастку і на прылеглых да яго тэрыторыях.

**Намеснік начальніка навукова-даследчай часткі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, навуковы кіраўнік НДЛ «Камп'ютарнае праектаванне мікра- і нанаэлектронных сістэм» Віктар СТЭМПІЦКІ** заўважыў, што падрыхтоўка кадраў з'яўляецца адной з найважнейшых задач для развіцця нашай дзяржавы. Складанасці, з якімі сутыкнулася сістэма вышэйшай адукацыі і школа ў сувязі з пандэміяй, сёння стараюцца пераадолець.

«У бягучым годзе вядзём работы, накіраваныя на развіццё сістэм электроннага навучання, распрацоўваем спецыяльныя адпаведных нарматыўныя акты, якія рэгламентавалі б адукацыйны працэс па спецыяльнасцях вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай прафесійнай адукацыі», — падкрэсліў ён.

«Акрамя традыцыйных адукацыйных і навуковых кампетэнцый, якія раней прапаноўваліся навучэнцам, мы прапануем на ўзроўні Міністэрства адукацыі пашырэнне навучання студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў у сферы прадпрымальніцкай дзейнасці, — сказаў Віктар Стэмпіцкі. — Для рэалізацыі гэтага праекта прыцягваем заказчыкаў кадраў, а гэта буйныя кампаніі і дзяржаўныя прадпрыемствы, а таксама прыватны бізнес».

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Меркаванне

# КАПРАМОНТ — СПРАВА МЯСЦОВАЯ

**Усебеларускі народны сход, які мае адбыцца ў лютым, ужо месяц як стаў адной з самых абмяркоўваемых тэм у краіне. Плануемы да разгляду на форуме пытанні хвалююць не толькі ўдзельнікаў, але і спецыялістаў самых разнастайных галін. Начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ Андрэй РАМАШКА лічыць, што ў спецыялістаў на месцах павінна быць больш самастойнасці і адказнасці пры прыняцці рашэнняў адносна арганізацыі працэсу абслугоўвання жыллёвага фонду краіны і забеспячэння яго метадалогіі, у прыватнасці, па пытаннях развіцця водазабеспячэння, замены існуючых зношаных цеплафасетак:**


Фота БелТА.

— Вядома, існуюць індыкатыўныя паказчыкі, ніжэй за якія апускацца нельга, і яны павінны вызначацца ўрадам краіны, аднак пытанні забеспячэння фінансавання, кантролю можна вырашаць на месцах. Асабліва гэта датычыцца капітальнага і бягучага рамонтаў. Многія інструкцыі і правілы прапісаны на ўзроўні актаў урада, аднак фактычна ўсе гэтыя пытанні маглі б рэгулявацца выключна абласнымі выканкамамі. У гэтых дакументах няма нічога звышскладанага і сур'ёзнага, што перашкаджала б самастойна арганізаваць згаданыя працэсы на ўзроўні рашэнняў выканкама. У нас жа пры самых нязначных пытаннях ці адхіленні ад інструкцый ідуць запыты ў вышэйшыя інстанцыі, што рабіць у тым ці іншым выпадку. Арганізацыя работы на месцах у прынцыпе ў цэлым сёння не дазваляе ўладам прымаць самастойныя рашэнні і несці за іх адказнасць. Тым не менш задача ўрада як рэспубліканскага органа вызначыць шлях, па якім трэба працаваць ў сістэме ЖКГ у цэлым, а якімі крокамі па ім ісці, павінны вырашаць ужо на месцах.

Крытычных пытанняў у эксплуатацыі жылля і яго рамонце пакуль няма. Аднак з тымі тэмпамі і ў тых аб'ёмах, якімі цяпер праводзіцца капрамонт, цяжка спрагназаваць, што будзе праз нейкі час. Запланаваныя штогадовыя аб'ёмы капрамонту ў 3 % набліжаюць нас да прадугледжаных нарматывамі тэрмінаў міжрамонтнай эксплуатацыі жылля (30-35 гадоў), але ж існуе яшчэ доля недарамонту (каля 13 млн $м^2$). І яго трэба выконваць дадаткова звыш запланаваных 3 %, каб скарачаць адставанне, якое мы дапусцілі ў 1990-х і 2000-х гадах і цяпер толькі падыходзім да яго ліквідацыі.

Грошай больш за тыя, што сёння прадугледжаны планамі на капітальны рамонт, не будзе. У будучым трэба думаць, што рабіць з працэсам фінансавання капрамонту, бо бюджэт сёння не забяспечыць тыя аб'ёмы работ, якія неабходна выконваць у жыллі. У той жа час амаль увесь жыллёвы фонд у нас прыватны, і, каб не дапусціць яго разбурэння, у краіне ў цэлым наспела неабходнасць прадугледжваць іншыя падыходы да фінансавання капрамонту з прыцягненнем да гэтай справы большай долі насельніцтва як уласніка жылля.

**Ірына СІДАРОК.**

Прапановы маладых

# Першае рабочае месца і ўласны дом

**На пленуме ў Цэнтральным камітэце БРСМ абраныя 140 прадстаўнікоў арганізацыі, якія будуць прадстаўляць інтарэсы маладых беларусаў на галоўным форуме народнай дыпламатыі. Сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, удзельнік Усебеларускага народнага сходу Аляксандра ГАНЧАРОВА адзначыла, што на гэтае мерапрыемства вылучаныя самыя годныя маладыя людзі, якія прадстаўляюць абсалютна розныя сферы.**

— Гэта студэнты, маладыя кіраўнікі прадпрыемстваў, рабочыя, вайскоўцы, інжынеры, педагогі, спартсмены, прадстаўнікі маладзёжных грамадскіх інстытутаў. Мы адкрыта абмяркоўвалі кожную кандыдатуру, да таго ж стараліся захаваць гендарны баланс: 51,8 % дэлегатаў — хлопцы, 48,2 % — дзяўчаты. 75,2 % вылучаных — гэта работнікі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, педагогі, рatavальнікі, прадстаўнікі сістэмы аховы здароўя, сродкаў масавай інфармацыі, служачыя, вайскоўцы, супрацоўнікі органаў і падраздзяленняў унутраных спраў МУС, лідары тэрытарыяльных арганізацый Саюза моладзі. 15,6 % — студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі і магістранты, прадстаўнікі ССНУ, 9,2 % — дэпутаты раённых Саветаў дэпутатаў, члены маладзёжных парламентаў розных узроўняў.

З пачатку года Саюз моладзі праводзіў дыскусійныя маладзёжныя пляцоўкі, у тым ліку і адкрытыя дыялогі, пад адзіным слоганам «Беларусь — гэта МЫ».

— Усяго за адзначаны перыяд нашымі тэрытарыяльнымі структурамі было праведзена звыш 450 такіх сустрэч з удзелам больш як сямі тысяч чалавек. Вынесеныя на абмеркаванне ініцыятывы закранaлі розныя пытанні, сярод іх — першае рабочае месца, забеспячэнне інтэрнатам маладых спецыялістаў, будаўніцтва ўласнага жылля, даступнасць арэнднага, фарміраванне ўмоў працы і заработнай платы, канстытуцыйныя змены, прапановы ў сферы адукацыі, культуры, патрыятычнага выхавання. На многіх дыскусійных пляцоўках гучала пытанне, якое закранае магчымасць стварэння нацыянальнага агенцтва або камітэта моладзі па пытаннях стратэгічнай рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, фарміравання ў моладзі трывалай ідэі патрыятызму, цвёрдай грамадзянскай пазіцыі. Названы камітэт займаўся б усімі катэгорыямі моладзі, пачынаючы са школьнікаў і заканчваючы маладымі спецыялістамі. Таксама сярод пачутых прапаноў — стварэнне маладзёжнага медыяхолдынга, у тым ліку навукова-метадычнага цэнтра, які будзе забяспечваць дзейнасць такога камітэта. Да таго ж многіх хвалюе тэма ўмацавання інстытута сям'і і падтрымка маладых сем'яў. Усе ініцыятывы, якія прагучалі, перададзеныя на разгляд аргкамітэта Усебеларускага народнага сходу.


Фота БелТА.

**Загадчык Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра Дзмітрый ТУРАНОК** адзначыў, што на сёння вельмі важна для моладзі мець патрыятычнае выхаванне, якое грунтуецца на подзвігах герояў Вялікай Айчыннай вайны і дасягненнях незалежнай Беларусі.

— Захаванне гістарычнай памяці, павага да дзяржаўных сімвалаў і традыцый беларускага народа — фактары ўстойлівага развіцця краіны. Калі моладзь удзельнічае і ініцыюе патрыятычныя праекты, яна не толькі ўносіць асабісты ўклад у захаванне гістарычнай, культурнай і духоўнай спадчыны, але і перадае сваім аднагодкам каштоўнасці, якія праз усё жыццё пранесла наша старэйшае пакаленне. Менавіта такія праекты, як рэспубліканскі маладзёжны цягнік «Беларусь. Моладзь. Натхненне», рэспубліканскі конкурс «Лідар года» і іншыя, спрыяюць станаўленню маладых. Вельмі важна, што ў нас заўсёды ёсць магчымасць на самым высокім узроўні ў фармаце дыялогу выказаць свой пункт гледжання па пэўнай тэме і ўнесці новыя ідэі і ініцыятывы. На рэспубліканскім узроўні актыўна функцыянуе каардынацыйны савет маладзёжных парламентаў, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў нашай краіны. Актыўна працягвае сваю работу Грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет пры міністру адукацыі, у яго склад уваходзяць прадстаўнікі ўсіх устаноў вышэйшай адукацыі краіны. Знакавымі падзеямі з'яўляюцца штогадовыя традыцыйныя нацыянальныя дзіцячыя і студэнцкія форумы, такі рух — практычны інструмент ва ўзаемадзеянні органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў у стварэнні ўмоў для паляпшэння становішча моладзі, пашырэння яе ўдзелу ў грамадскім жыцці.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ТРАЕКТОРЫЯ РАЗВІЦЦЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

***— Працягласць жыцця павялічылася...***

— Вынікам удасканалення аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву, павышэння яе даступнасці і якасці стала павелічэнне чаканай працягласці жыцця жыхароў вобласці: летась — 73,6 года (у 2015 годзе — 72,4). Ключавое пытанне, якому трэба ўдзяляць вялікую ўвагу: захаванне і прымнажэнне дэмаграфічнага патэнцыялу, стварэнне камфортных умоў жыцця. Значнасць чалавечага рэсурсу (адукацыя, інтэлект і кампетэнцыі) узрастае ва ўмовах глабальнай нявызначанасці і нарастаючай канкурэнцыі адначасова з барацьбой за знешнія рынкі, стымуляванне ўнутранага попыту, эфектыўнае выкарыстанне мясцовых рэсурсаў, інавацыі і лічбавізацыі ўсіх сфер.

***— Якія асноўныя кірункі інвестыцыйнай праграмы на 2021—2025 гады?***

— На працягу 2021—2025 гадоў на развіццё эканомікі вобласці будзе накіравана 18,4 млрд рублёў інвестыцый у асноўны капітал, што складзе 106,7 % да ўзроўню 2020 года. На набыццё машын, абсталявання, транспартных сродкаў будзе выкарыстана 7565 млн рублёў. Удзельная вага дадзеных затрат у агульным аб'ёме інвестыцый ацэньваецца ў 41,2 %. На будаўніча-мантажныя работы будзе накіравана 9849,2 млн рублёў, або 53,7 % аб'ёму інвестыцый у асноўны капітал.

У разрэзе відаў эканамічнай дзейнасці асноўнымі кірункамі капітальных укладанняў стануць: прамысловасць — 42 %, у тым ліку апрацоўчая прамысловасць — 31,9 %, сельская, лясная і рыбная гаспадарка — 19,5 %, сфера паслуг — 37,5 %.

У сферы паслуг асноўнае прыпадае на аперацыі з нерухомай маёмасцю — 14,3 % ад агульнага аб'ёму інвестыцый вобласці, што абумоўлена жыллёвым будаўніцтвам.

У наступнай пяцігодцы запланавана рэалізацыя 269 інвестыцыйных праектаў. Сярод іх 58 — новых, 67 — па мадэрнізацыі, рэканструкцыі і тэхнічным пераўзбраенні дзеючых вытворчасцяў, 110 — інфраструктурных. Прыярытэтныя кірункі інвестыцыйнай дзейнасці ў 2021—2025 гадах — апераджальнае прыцягненне інвестыцыйных рэсурсаў у вытворчую сферу і канцэнтраванне іх на рэалізацыі інвестыцыйных праектаў экспартнай і імпартазамяшчальнай накіраванасці. Па-ранейшаму вельмі важнае садзейнічанне замежным інвестарам у стварэнні новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў. Трэба актывізаваць ўцягненне ў гаспадарчы абарот маёмасці.

***— Якія вытворчасці будуць створаны ў вобласці?***

— У Наваполацку запланавана вытворчасць па гарачай ацынкоўцы. Між іншым, у гэтым прыкладзе з агульнага аб'ёму інвестыцый (41,3 млн рублёў) палова — сродкі інавацыйнага фонду Віцебскага аблвыканкама.

У Віцебску таксама пры вялікай фінансавай падтрымцы з боку абласной улады пабудуюць завод па вытворчасці інавацыйных ветэрынарных прэпаратаў серыі «Зялёная лінія — альтэрнатыва антыбіётыкам» з улікам патрабаванняў сістэмы GMP і з укараненнем сусветных падыходаў да праектавання, кантролю і кіравання вытворчасцю. Агульны аб'ём інвестыцый складзе 15,7 млн рублёў. У Лёзненскім раёне запусцяць вытворчасць сыроў з цвіллю. У Віцебскім раёне будзе пабудаваны цэх забою і перапрацоўкі мяса птушкі, а таксама бройлерны цэх ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка». У Чашніцкім раёне кітайскімі інвестарамі плануецца стварыць комплекс па вырошчванні каштоўных парод рыб для атрымання ікры. Там жа ёсць намер пабудаваць турыстычны цэнтр.

***— Алег Сяргеевіч, якія праекты мяркуецца рэалізаваць на Аршаншчыне, дзе па ініцыятыве Прэзідэнта вельмі паспяхова вядзецца «перазагрузка» ўсіх сфер?***

— На аршанскім ААТ «Завод «Легмаш» плануецца выраб камплектуючых для нафтагазавай прамысловасці і літых вырабаў для патрэб Беларускай чыгункі. А на прадпрыемстве «Тэхніка сувязі» да 2023 года плануюць засвоіць поўны цыкл вытворчасці сродкаў сувязі (тэлефонныя апараты, камп'ютары, мадэмы), будуць працягвацца работы па асваенні выпуску прафесійных сродкаў радыёсувязі стандарту DMR, LTE і стварэнні вытворчасці валаконна-аптычнага кабелю для камплектавання рухомых комплексаў сувязі і АСК. На Аршанскім мясакансервавым камбінаце запланавана будаўніцтва новага цэха.

***— Ці можна канстатаваць, што ў вобласці вырабляецца ўсё больш інавацыйнай прадукцыі? Напэўна, яна заўсёды будзе ў першую чаргу цікавіць пакупнікоў і патэнцыйных партнёраў для збыту і сумесnай распрацоўкі новых тавараў і паслуг?***

— Трэць прадукцыі, што вырабляецца нашай прамысловасцю, інавацыйная. Гэта самы высокі паказчык у краіне. У параўнанні з 2010 годам доля такой прадукцыі павялічылася на 15 %.

На «Віцязі» створана вытворчасць па выпуску сродкаў зараднай інфраструктуры для электрамабіляў. Кампаніяй «Віцебскія пад'ёмнікі» выраблены самы высокі гідрапад'ёмнік у краінах СНД і Усходняй Еўропы з вышынёй пад'ёма 52 метры. Прадпрыемствам «Віцебскія дываны» арганізавана ўласная вытворчасць поліпрапіленавых нітак. «Энергакамплект» пачаў выпуск новай прадукцыі — унікальны для нашай краіны водаахалоджваемы кабель для металургічнай прамысловасці.

У вобласці дзейнічае 24 арганізацыі, якія выконваюць навуковыя даследаванні і распрацоўкі. Там працуе каля 610 чалавек. Для стымулявання інавацыйнай дзейнасці суб'ектаў гаспадарання працуюць навукова-тэхналагічныя паркі: на базе Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, інкубатара малога прадпрымальніцтва ТАА праваой групы «Закон і Парадак», функцыянуе цэнтр трансферу медыцынскіх і фармацэўтычных тэхналогій пры Віцебскім дзяржаўным ордэна Дружбы народаў медыцынскім універсітэце. Структурныя падраздзяленні тэхнапаркаў ствараюцца ў Оршы і Наваполацку.

Інавацыйную дзейнасць шляхам укаранення тэхналагічных, арганізацыйных і маркетынгавых інавацый ажыццяўляюць 64 арганізацыі, з іх 59 — у прамысловасці. У мэтах стварэння дадатковых умоў фінансавай падтрымкі інавацыйнага развіцця штогод фарміруецца спецыялізаваны фонд Віцебскага аблвыканкама.



Жыллё ў «спальным» віцебскім мікраraёне «Білева», у прыватнасці дом, які пабудавалі з прыцягненнем кітайскіх інвестыцый.

***— Якія перспектывы ў аграпрамысловага комплексу?***

— За пяцігодку плануецца павялічыць аб'ёмы вытворчасці валавой прадукцыі больш чым на 26 %. У 2025-м плануецца сабраць 1135,9 тысячы тон збожжа, рапсу — 152,2 тыс. тон, ільноваловкна — 15,2 тыс. тон; атрымаць: малака — 965 тыс. тон, прадукцыі ад вырошчвання жывёлы і птушкі — 314,7 тыс. тон, яек — 439,4 млн штук.

У раслінаводчай галіне плануецца аптымізаваць структуру пасяўных плошчаў, накіраваную на забеспячэнне грамадскай жывёлагадоўлі зернефуражом, травяністымі кармамі, раслінным бялком, перапрацоўчую прамысловасць — сыравінай.

Гэта будзе забяспечана найперш за кошт павышэння прадукцыйнасці сельскагаспадарчых угоддзяў шляхам выканання тэхналагічных рэгламентаў вырошчвання культур і ўдасканалення тэхналагічных прыёмаў, а таксама прымянення новых і перспектыўных сартоў і гібрыдаў. Будзе захавана тэндэнцыя набыцця высокапрадукцыйных сельскагаспадарчых машын, якія адказваюць патрабаванням сучасных тэхналогій вытворчасці прадукцыі раслінаводства, нарыхтоўкі высакаякасных кармоў у аптымальныя агратэхнічныя тэрміны.

***— Якія планы развіцця будаўнічага комплексу?***

— За пяцігоддзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю каля 1,57 мільёна квадратных метраў жылля. У 2025-м узровень забяспечанасці насельніцтва жыллём складзе не менш за 29,6 квадратнага метра на чалавека (у 2020-м — 28,9).

Долю пабудаваных жылых дамоў з выкарыстаннем электрычнай энергіі для мэт вода- і цеплазабеспячэння, гатавання ежы ў 2025 годзе плануецца давесці да 70 %. Будзе палепшана работа па забеспячэнні жыллёвага будаўніцтва інжынерна-транспартнай інфраструктурай. Трэба будзе распрацаваць перспектыўныя схемы адпаведнага забеспячэння населеных пунктаў і тэрыторый. Прадугледжана апераджальнае будаўніцтва мінімальна неабходнай інжынернай і транспартнай інфраструктуры, у тым ліку за кошт забудоўшчыкаў пры комплексным асваенні зямельных участкаў.

Развіццю будаўніцтва будзе спрыяць рост інвестыцый заказчыкаў на будаўніцтва і рэканструкцыю аб'ектаў, перш за ўсё ў рамках дзяржаўнай і мясцовых інвестыцыйных праграм.

***— Што мяркуецца пабудаваць і рэканструяваць у сацыяльнай сферы?***

— Распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя на будаўніцтва дзіцячай дашкольнай установы, сумешчанай з блокам пачатковых класаў, у віцебскім мікраraёне «Білева-3» на 850 месцаў. Завяршыць яе ўзвядзенне плануецца налета. Да 2025 года запланавана будаўніцтва яшчэ сямі дзіцячых садкоў у Віцебску, Оршы, Полацку, Наваполацку, Лепелі, Мёрах.

Сёлета ў Полацку плануецца завяршыць праект па рэканструкцыі былых будынкаў установ аховы здароўя ў ахоўнай зоне запаведніка (Верхні замак) пад размяшчэнне кадэцкага вучылішча. Таксама мяркуецца ажыццявіць мадэрнізацыю будынка вучэбна-бытавога корпуса з узвядзеннем сістэмы водапаніжэння ў Полацкім дзяржаўным хіміка-тэхналагічным каледжы.

У 2021—2022 гадах плануецца правесці капітальны рамонт з мадэрнізацыяй будынка навучальнага корпуса № 1 Наваполацкага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. У 2023-м — капрамонт даху будынка ў Віцебскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы лёгкай прамысловасці.

Вядуцца работы па будаўніцтве новага корпуса дзіцячага рэабілітацыйна-аздараўленчага цэнтра «Жамчужына», завяршэнне якіх плануецца ў 2021 годзе. Налета завяршаецца рэканструкцыя будынка пад наркалагічнае аддзяленне Віцебскага абласнога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і наркалогіі, рэканструкцыя з мадэрнізацыяй інжынерных сетак Сенненскай цэнтральнай раённай бальніцы. Працягваецца рэканструкцыя абласнога клінічнага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі для інвалідаў і ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, Віцебскай гарадской цэнтральнай клінічнай бальніцы.



Прадукцыя віцебскага прадпрыемства, дзе вырабляюць унікальныя пад'ёмнікі.

У 2022—2023 гадах намечана выканаць капітальны рамонт з заменай тэхналагічнага абсталявання харчблока Полацкай цэнтральнай гарадской бальніцы. У 2022—2024-х прадугледжваецца будаўніцтва паліклінікі ў новым мікраraёне «Аэрапорт» у Полацку. На 2024 год таксама ў Полацку запланавана правядзенне рэканструкцыі цэнтральнай гарадской паліклінікі з устаноўкай ліфта. Да канца 2025-га плануецца будаўніцтва аперацыйна-рэанімацыйны корпус Віцебскага абласнога клінічнага кардыялагічнага цэнтра.

***— Усё больш выгадны ў нашай краіне становіцца ўязны турызм. Як мясцовая ўлада можа дапамагчы яго развіццю?***

— Індустрыя турызму і падарожжаў з'яўляецца адным з асноўных драйвераў развіцця сусветнай эканомікі. У нас плануецца павелічэнне ўдзельнай вагі такіх турпаслуг у агульным аб'ёме іх экспарту да 15 %. Неабходна дыверсіфікацыя напрамкаў руху пры ўязным турызме, павелічэнне долі турыстаў з паўднёва-ўсходніх краін. Запланавана давесці сярэдні ўзровень даходаў ад аднаго замежнага наведвальніка з 71 да 150 долараў.

Сярод іншага мы будзем актыўна спрыяць развіццю сацыяльнага лячэбна-рэкрэацыйнага і аздараўленчага турызму для дзяцей, людзей з абмежаванымі магчымасцямі і пенсіянераў. Каб у турыстаў на аўто не было праблем, будуць устанаўліваць станцыі падзарадкі электрамабіляў, будаваць стаянкі і прылады для абслугоўвання тых, хто падарожнічае ў «дамах на колах». Экспрэс-мыйкі аўтамабіляў, размяшчэнне банкаматаў і пунктаў абмену валют без удзелу прадстаўнікоў банка — усё гэта паспрыяе павелічэнню колькасці турыстаў.

А каб было яшчэ больш уражанняў, працягнецца рэстаўрацыя помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны. Трэба распрацоўваць механізмы пашырэння праграмы дзяржаўна-прыватнага партнёрства і прыцягнення пазабюджэтных інвестыцый для кансервацыі, рэстаўрацыі і музеефікацыі.

Такія падыходы ў кароткатэрміновай і доўгатэрміновай перспектыве будуць уплываць на змены ў аб'ёме і структуры попыту, на магчымасці выкарыстання нетрадыцыйных для сферы турызму тэхналагічных рашэнняў, вызначаць узровень канкурэнтаздольнасці турпрадукту на ўнутраным і знешнім рынках.

**Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

Экспертнае меркаванне

# «Рынак «новых медыя», як і любы іншы рынак, мае пад сабой эканамічную аснову»



**У працяг тэмы ролі «новых» і традыцыйных медыя ва ўнутрыпалітычных працэсах у Беларусі, узнятай у мінулым нумары ў інтэрв'ю са старшынёй Беларускага саюза журналістаў Андрэем Крывашэевым, «Звязда» пагутарыла з палітычным аглядальнікам Аляксандрам ШПАКОЎСКІМ. Эксперт, маючы ўласны вопыт вядзення старонак у месенджарах, расказаў пра магчымасці гэтых медыя ў фарміраванні грамадскай думкі.**

***— Як дастукацца да людзей, выкарыстоўваючы магчымасці «новых медыя»?***

— Так званыя новыя медыя, пад якімі маюцца на ўвазе віртуальныя суполкі, інфармацыйныя каналы ў сацыяльных сетках і месенджарах, паступова набываюць усё большую вагу ў якасці інструмента фарміравання грамадскай думкі.

Гэта не азначае, што «новыя медыя» выцясняюць традыцыйныя сродкі масавай інфармацыі (тэлебачанне, радыё, друкаваныя выданні, інтэрнэт-рэсурсы). Аднак трэба прывыкнуць да таго, што побач з агульнапрынятымі крыніцамі ўжо існуе і працягвае развівацца сегмент іншых медыя, якія нярэдка маюць большую аўдыторыю. Пры гэтым, у адрозненне ад традыцыйнай прэсы, «новыя медыя» амаль не падпарадкоўваюцца ніякім правілам, акрамя нормаў сацыяльнай сеткі альбо месенджара, а праўдзівасць іх інфармацыі нярэдка залежыць толькі ад сумлення аўтара.

Аднак менавіта гэты фактар ілюзорнай незалежнасці ад закона, рэдакцыйнай палітыкі, а таксама аператыўнасць павед амленняў, якія імгненна трапляюць да падпісчыкаў у рэжыме рэальнага часу, прыцягваюць масавую аўдыторыю да рэсурсаў такога кшталту.

Чаму я кажу аб ілюзорнасці? Таму што, па-першае, рынак «новых медыя», як і любы іншы рынак, мае пад сабой эканамічную аснову, дзе ёсць попыт і прапанова, а гэта, у сваю чаргу, значыць, што многія «народныя» каналы насамрэч маюць свой кошт і абслугоўваюць пэўныя задачы. У адрозненне ад афіцыйных СМІ, з «новымі медыя» бывае цяжка зразумець, хто ўласнік рэсурсу і аўтар матэрыялаў, не кажучы ўжо аб тым, хто з'яўляецца сапраўдным замоўцам публікацый.

Па-другое, і гэта наглядна прадэманстравалі прэзідэнцкія выбары ў ЗША, апошняе слова на рынку «новых медыя» заўжды застаецца за ўласнікамі пляцовак — сацыяльных сетак ды месенджараў, дзе месцяцца гэтыя рэсурсы. Можна мець вельмі моцныя інструменты «новых медыя», як, напрыклад, у былога прэзідэнта ЗША Дональда Трампа, але яны знянацку могуць быць заблакаваныя, бо ўласнікі «Твітэра» ці «Фэйсбука» маюць іншую палітычную пазіцыю.

Зыходзячы з вышэйсказанага, рызыкну прагназаваць, што ўжо ў хуткім часе рынак «новых медыя», як і агулам сацыяльных сетак, месенджараў і цалкам інтэрнэту, сутыкнецца са спробамі ўрадаў розных краін унесці элементы заканадаўчага рэгулявання ў гэтую галіну. Падобныя працэсы ўжо разгортваюцца на нашых вачах.

***— Вы актыўна выкарыстоўваеце «новыя медыя», каб прадставіць свае думкі грамадскасці. На вашым тэлеграм-канале некалькі тысяч падпісчыкаў. Хто ваша аўдыторыя?***

— На сёння я маю каля пяці тысяч падпісчыкаў на сваім тэлеграм-канале «Шпаковский. По существу». Прыкладна такая ж колькасць сяброў і падпісчыкаў на старонцы ў «Фэйсбуку», якую выкарыстоўваю ў асноўным дзеля прафесійнай камунікацыі. Насамрэч аўдыторыя яшчэ большая, бо трэба ўлічваць сумарныя прагляды постаў, якія могуць значна перавышаць колькасць падпісчыкаў.

Пры гэтым я імкнуся публікаваць розны кантэнт, пазбягаць дубліравання. Напрыклад, у «Фэйсбуку» ёсць уласныя фотаздымкі, элементы асабістага жыцця, я сам часам дыскутую ў каментарыях. У «Тэлеграме» змяшчаецца выключна аўтарская палітычная аналітыка, датычная да працэсаў у нашай краіне, на постсавецкай прасторы, а таксама актуальных падзей у свеце.

Аўдыторыя складаецца як з беларусаў, так і з замежнікаў. Прычым гэта людзі рознага ўзросту і сацыяльнага статусу: ад міністраў да студэнтаў. Аб'ядноўвае іх цікавасць да палітыкі і, напэўна, да майго меркавання аб актуальных падзеях нашага жыцця.

***— Як, на ваш погляд, «новыя медыя» (і ў прыватнасці ваша публікацыі) могуць аб'ядноўваць людзей?***

— Я імкнуся, каб мае публікацыі выхоўвалі ў людзей палітычную культуру ўзаемапавагі, непрымальнасць экстрэмісцкіх ідэалогій, любых праяў шавінізму, а таксама брудных палітычных тэхналогій, у прыватнасці «каляровых рэвалюцый». Адначасова, як аўтар, я імкнуся даносіць беларускім чытачам каштоўнасці патрыятызму, а замежнікам — павагу да беларускай дзяржавы, якая выбрала няпросты суверэнны шлях, імкнучыся заняць свой пачэсны пасад між народамі.

Фінансы

# ЧЫСТАЯ ІПАТЭКА ПАД ЗАКЛАД КВАТЭРЫ

**Другі месяц года пачаўся з важнай навіны для тых «бескватэрных» жыхароў нашай краіны, хто менавіта сёлета запланаваў вырашэнне свайго жыллёвага пытання. Зараз гэта можна будзе зрабіць з дапамогай крэдытнай праграмы Беларусбанка. Найбуйнейшы фінансавы інстытут краіны выпусціў новы прадукт — крэдыт «Іпатэка Экспрэс».**

Крэдыт даецца на куплю жылых памяшканняў у памеры да 100 % кошту набытага жылля тэрмінам да 20 гадоў. Спецыялісты рынку нерухомасці ўжо назвалі гэты фінансавы прадукт сапраўды хуткім крэдытам, таму што банк прымае рашэнне па заяўцы на крэдыт не пазней наступнага рабочага дня пасля рэгістрацыі заявы-анкеты.

У цяперашні няпросты час галоўнай перавагай дадзенай пазыкі з'яўляюцца канкурэнтаздольныя ўмовы пагашэння і працэнтная стаўка. Так, пагашэнне асноўнага доўгу па крэдыце пачынаецца з наступнага месяца пасля выдачы крэдыту (часткі крэдыту), а пагашэнне працэнтаў ажыццяўляецца за фактычны час карыстання ім. Працэнтная стаўка па крэдыце (на пачатак лютага 2021 года) складае 21 % (стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка, павялічаная на 13,25 %).

І галоўнае: крэдыт выдаецца толькі пад заклад (іпатэку) набытага жылога памяшкання, якое не абцяжарана правамі трэціх асоб і арыштамі, з улікам нормаў Указа № 130 «Аб іпатэчным жыллёвым крэдытаванні».

# Біткоін выходзіць з «шэрай» зоны?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама велізарны плюс гэтай валюты — ананімнасць. Пры ажыццяўленні плацяжу ўладальнік кашалька сам вырашае, хоча ён паказаць нумар рахунку, з якога ажыццяўляе грашовы перавод, або не.

Ну і, вядома ж, бяспека. На дадзены момант гэта самая надзейная сістэма захоўвання, якая абаронена крыптаграфічным ключом. Апошняе практычна выключае магчымасць узлому вашага кашалька. Безумоўна,

**Паводле ацэнак многіх экспертаў, абарот на расійскім рынку крыптавалюты складае каля 1 млрд долараў у месяц і практычна ўвесь знаходзіцца «ў ценю».**

што магчымыя крадзяжы датычацца ўсяго, што «дрэнна ляжыць». Цяпер я кажу пра тое, што, па-першае, віртуальныя грошы ў ашуканцаў усё яшчэ мала карыстаюцца попытам, бо іх прымяненне не такое распаўсюджанае, як у звычайных грошай. А, па-другое, самі віртуальныя грашовыя сродкі больш складана займець, таму што людзі, якія выкарыстоўваюць у разліках віртуальныя грошы, найбольш адукаваныя з пункту гледжання абароны сваёй інфармацыі. Вядома, усюды прысутнічае чалавечы фактар, і калі крыптавалюта была ўкрадзена ашуканцам, то гэта выключна бестурботнасць уладальніка кашалька.

***— «Біток» і ў нашых краінах мае масу плюсаў, аднак у афіцыйнай эканоміцы яго ўсё ж такі няма?***

— Больш чым у дзесяці краінах свету крыптавалюта прызнана легальным плацежным сродкам, шырока выкарыстоўваецца для аплаты паслуг і куплі тавараў. У заканадаўстве Расіі і Беларусі да яе пакуль ставяцца з асцярогай і зусім не спяшаюцца ўводзіць гэты тып грошай у дзяржаўную эканоміку.

Сёння ўладальнікі тых жа біткоінаў могуць толькі абменьваць або купляць іх. Аднак вядомы Інстытут беларускай крыптабіржы не з'яўляецца «элементам» заканадаўства. Чыстай крыптавалютай разлічыцца легальна вы не зможаце. Крыптабіржа дазваляе абмяняць віртуальныя грошы на легальныя. Безумоўна, што ўсе юрыдычныя асобы, якія афіцыйна ўдзельнічаюць у ланцужку здзяйснення здзелкі, атрымліваюць сваю камісію ў валюце, якая афіцыйна дзейнічае на тэрыторыі краіны.

***— А як цяпер (напрыклад, у Расіі) адбываецца працэс абмену звычайнай валюты на крыптавалюту і наадварот? Рэгулюецца ён законам?***

— Практычна — ніяк. Напрыклад, у Расіі такія аперацыі часцей за ўсё адбываюцца не толькі ананімна, але і па-за прававым полем.

Чалавек часам літаральна з торбай грошай прыходзіць у офіс і просіць абменьваць іх на крыптавалюту. Без дакументаў, без пацвярджэння асобы і, вядома ж, без пытанняў пра паходжанне гэтых сродкаў. Нейкі час ён чакае, пакуль яго грошы палічаць і набытую валюту пераведуць на яго электронны кашалёк. Гэта можа займаць да паўгадзіны (у залежнасці ад сумы). Пасля таго як крыптавалюта залічваецца на кашалёк кліента, здзелка лічыцца завершанай. Так выглядае стандартная працэдура куплі біткоінаў у Расіі.



У інтэрнэце і тэлеграм-каналах знаходзіцца маса прапаноў па абмене крыптавалюты. У гэтай краіне вялікая колькасць абменнікаў размешчана ў буйных гарадах. Некаторыя працуюць усяго па некалькі месяцаў, а потым мяняюць сваё месцазнаходжанне.

Спецыфіка гэтых аперацый звязана з тым, што ў Расіі падобныя здзелкі ніяк не рэгулююцца заканадаўствам. Афіцыйна крыптавалюта не дазволена, але пры гэтым яе не забаронена выкарыстоўваць, купляць і мяняць на фіятную валюту (грошы, якія выпускаюцца ўрадам краіны). Фактычна гэтыя грошы не адлюстроўваюцца ні ў падатковай сістэме, ні ў Цэнтральным банку. Таму адсачыць абароты дадзенага рынку пакуль практычна немагчыма.

***— Наколькі я ведаю, у нашай краіне падобны абмен — досыць празрыстая працэдура...***

— Што накont Беларусі, то зусім нядаўна нашым грамадзянам быў прадстаўлены сэрвіс whitebird.io. У дадзеным праекце мы забяспечваем тэхнічную магчымасць — перавод фіятных грошай на банкаўскую карту. Сэрвіс найперш прызначаны для звычайных карыстальнікаў, якія жадаюць набыць крыптавалюту, і легальнасць гэтага сэрвісу дае пэўныя гарантыі. Сёння ён разлічаны на грамадзян Расіі і Беларусі, але ў будучыні карыстацца гэтым сэрвісам змогуць жыхары краін СНД, Украіны і Грузіі.

На дадзены момант тут можна правесці фінансавыя аперацыі толькі з біткоінам, але распрацоўшчыкі абяцаюць, што ў найбліжэйшы час будуць уведзены і іншыя віды крыптавалюты.

Для пачатку карыстальніку неабходна зарэгістравацца ў сістэме. Са зразумелым інтэрфейсам сэрвісу гэта зойме да паўгадзіны. Падобная працэдура праводзіцца адзін раз. А далей вы заходзіце ў сістэму пад сваім лагінам і паролем. Купля ці продаж крыптавалюты доўжыцца некалькі хвілін. Біткоіны залічваюцца на ваш асабісты кашалёк, а грашовая сума — на картку банка Visa.

Паводле ацэнак многіх экспертаў, абарот на расійскім рынку крыптавалюты складае каля 1 млрд долараў у месяц і практычна ўвесь знаходзіцца «ў ценю».

***— Наша краіна з моманту прыняцця Дэкрэта «Аб развіцці лічбавай эканомікі» з'яўляецца адной з самых перадавых у плане заканадаўства краін, якія бяруць удзел у кадыфікацыі крыптазоны. Што атрымалі мясцовыя прадпрымальнікі з прыняццем новага нарматыўнага акта?***

— У дадзеным дакуменце сабраны беспрэцэдэнтныя ўмовы для рэалізацыі вядзення бізнесу па IT-кірунку. Дэкрэтам вызначана, што фізічныя асобы могуць валодаць токенамі, майніць, захоўваць, абменьваць, купляць, адчужаць, дарыць і завяшчаць, але не праводзіць аперацыі з «віртуальнай валютай». Юрыдычныя асобы — рэзідэнты ПВТ маюць магчымасць аказваць паслугі крыптабірж, абмену крыптавалют, а таксама прыцягваць фінансаванне з дапамогай ICO і TSO.

Што датычыцца іншых ільготных умоў вядзення бізнесу для рэзідэнтаў ПВТ, то сюды можна аднесці падатковыя льготы або 0 % падатку для ПДВ, падатку на прыбытак, афшорнага збору, мытных пошлін пры ўвозе тэхналагічнага абсталявання, падатку на даходы замежных арганізацый, у тым ліку пры продажы сваіх акцый (доляў) у кампаніях-рэзідэнтах ПВТ, ПДВ і падатак на прыбытак на майнінг, куплі/продажу і абмену крыптавалют, іншых аперацый з токенаў. У сваю чаргу, вы павінны адлічваць адміністрацыі ПВТ пэўны працэнт ад даходаў. Гэта трэба рабіць чатыры разы на год пасля падачы квартальнай справаздачнасці.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Мясцовае Самакіраванне

5 лютага 2021 г. № 4 (589)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ



Фота БелТА.

# ЗА КОЖНЫМ ЗВАРОТАМ БАЧЫЦЬ ЧАЛАВЕКА

**Днямі адбылося выязное пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі. Тэма была абрана злабадзённая — аб эфектыўнасці і выніках работы адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска, дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у 2020 годзе.**

## У рэчышчы новай традыцыі

Пасяджэнне прайшло на базе адміністрацыі Маскоўскага раёна, што, па словах старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ, было абсалютна ў рэчышчы новай традыцыі работы верхняй палаты парламента — праводзіць пасяджэнні Прэзідыума менавіта на выездзе. Такая практыка апраўдала сябе, бо сенатарам на месцы працей ажыццяўляць зваротную сувязь, аб'ектыўна ацэньваць сітуацыю ў арганізацыях, на прадпрыемствах і ў навучальных установах, бачыць неабходнасць наспелых змен у тым ці іншым законе ці ў распрацоўцы новага закона.

Увогуле работа мясцовай улады, дэпутацкага корпуса са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб заўсёды была няпростая, актуальная, і настолькі ж важнай яна застаецца сёння. Таму зразумелая цікавасць сенатараў да дзейнасці адміністрацыі Маскоўскага раёна ў гэтай сферы. Тым больш што сёлета ў Савеце Рэспублікі мяркуецца разгледзець законапраект «Аб рабоце са зваротамі грамадзян». Сёння з'яўляюцца і новыя формы, якія ўжо сябе нядрэнна зарэкамендавалі: дыялогавыя пляцоўкі, грамадскія прыёмныя, выязныя мерапрыемствы інфармацыйна-прапагандысцкіх груп. Радуе, што работа праводзіцца эфектыўна, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яшчэ трэба адзначыць, што своечасовы і якасны разгляд зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб з'яўляецца адным з прыярытэтаў дзейнасці Савета Рэспублікі. Невыпадкова летась яго членамі было разгледжана амаль 4000 пісьмовых зваротаў. Гэта прыкладна столькі ж, колькі за ўвесь перыяд работы верхняй палаты парламента папярэдняга склікання.

У 2020 годзе найбольш зваротаў у Савет Рэспублікі паступіла ад мінчан — 1080. Людзі звярталіся па даволі шырокім спектры праблем і пытанняў, якія ў асноўным датычыліся хібаў і праліказў у жыллёва-камунальнай гаспадарцы, рэалізацыі жыллёвай палітыкі ў сталіцы, недахопаў у архітэктуры і будаўніцтве, работы прадпрыемстваў гандлю і бытавога абслугоўвання насельніцтва, адукацыі, сацыяльнага забеспячэння, дзейнасці таварыстваў уласнікаў.

Сярод разгледжаных пытанняў была сітуацыя з недабудаваным жылым комплексам «Грушаўскі пасад». Яна была разгледжана Прэзідыумам Савета Рэспублікі, і ўжо ёсць шляхі вырашэння праблемы.

## «Наш раён можна лічыць асаблівым»

Кіраўнік адміністрацыі Маскоўскага раёна Таццяна КАЛЯДКА нагадала, што гэты раён — адзін з самых маладых, дынамічных і перспектыўных у сталіцы. Ён другі як па сваёй тэрыторыі, так і па колькасці насельніцтва — трохі больш за трыста тысяч чалавек. У раёне знаходзяцца і знакавыя для эканомікі горада прадпрыемствы, і вядомыя ў Беларусі ўстановы аховы здароўя, напрыклад, навукова-практычны цэнтр «Кардыялогія», Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі. У раёне размешчаны і вядучыя ВНУ краіны, такія як Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Таму дадзены раён можна лічыць асаблівым, кажа яго кіраўнік Таццяна Калядка.

Але ён у пэўным сэнсе асаблівы і ў дачыненні работы з насельніцтвам. Тут назапашаны цікавы і карысны досвед у вырашэнні праблемных пытанняў. Трэба адзначыць, што адміністрацыя Маскоўскага раёна вылучаецца эфектыўнасцю работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб. У гэтым сэнсе цікавым і змястоўным было выступленне дэпутата гарсавета Ірыны ЛЕЎКАВЕЦ аб узаемадзеянні дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета ад Маскоўскага раёна з органамі мясцовага кіравання і арганізацыямі сталіцы.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПРАПАНОВЫ, ІНІЦЫЯТЫВЫ, ПРОСЬБЫ

агучваліся падчас традыцыйнай суботняй прамой лініі ў Савеце Рэспублікі, якую правёў віцэ-спікер Анатоль ІСАЧАНКА



— Сёння да нас паступіла больш прапаноў і ініцыятыў, чым асабістых зваротаў. І гэта цешыць: нашы грамадзяне займаюць усё больш актыўную пазіцыю, агучваюць шмат заўваг і просяць улічыць іх меркаванні ў розных сферах. У прыватнасці, па механізмах выдзялення арэнднага жылля маладым спецыялістам, замацавання кадраў у сельскай мясцовасці, па пытаннях удасканалення пенсійнай сістэмы, паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне, а таксама па многіх іншых, — адзначыў у гутарцы з журналістамі намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

Так, на працягу ўсіх трох гадзін, якія былі адведзены на правядзенне прамой лініі, не сціхалі тэлефонныя званкі. Тэлефанавалі з прапановамі для разгляду на VI Усебеларускім народным сходзе: магілёўчанка Ірына Міхайлаўна — па бестэрміновым замацаванні паўнамоцтваў дзеючага кіраўніка дзяржавы, жыхар Быхава Анатоль Іванавіч звяртаў увагу на важнасць тэхнічнай мадэрнізацыі вытворчасцяў.

Былі і асабістыя звароты. Мінчанку Алену Аркадзеўну хвалюе зямельнае пытанне і вызначэнне граніц яе ўчастка ў садаводчым таварыстве. Другую сталічную жыхарку непакоіць стан вентыляцыйнай сістэмы ў яе кватэры. Жыхарка Рагачова Алена Міхайлаўна звярнула ўвагу на неабходнасць пашырыць права карыстання сацыяльным таксі, каб яно было даступнае не толькі для інвалідаў I групы, але і для ўсіх, хто мае ў ім патрэбу.

На думку Анатоля Ісачанкі, работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб з'яўляецца першачарговай для ўсіх дзяржаўных служачых. Ён падкрэсліў значнасць удзелу ўсіх:

— Мы адкрытыя, мы чуем кожнага. Усе прапановы будуць дэталёва вывучаны і ўлічаны, — рэзюмаваў ён.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

# Магчымасці для актыўных

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правяла рабочую нараду па пытанні рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў.**

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, удзельнікі нарады абмеркавалі механізм фінансавання мерапрыемстваў, якія маюць прыярытэтнае значэнне для грамадзян, па рашэнні пытанняў мясцовага значэння, а таксама пашырэння магчымасцяў людзей па ўдзеле ў бюджэтным працэсе.

Удзельнікамі нарады былі ўнесены прапановы па заканадаўчым рэгуляванні грамадзянскіх ініцыятыў і вызначэнні крыніц іх фінансавання.

Адзначым, што ў нарадзе ўдзельнічалі прадстаўнікі міністэрстваў фінансаў і адукацыі, ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», мясцовых Саветаў дэпутатаў і фінансавых органаў аблвыканкамаў, а таксама работнікі сакратарыята Савета Рэспублікі.

# ЗА КОЖНЫМ ЗВАРОТАМ БАЧЫЦЬ ЧАЛАВЕКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Удзельнікі пасяджэння азнаёміліся таксама з работай службы «Адно акно» ў будынку адміністрацыі Маскоўскага раёна. Даведачную інфармацыю можна атрымаць па нумары 142. У памяшканні ў анлайн-рэжыме працуе відэакамера, якая на сайце адміністрацыі дазваляе кожнаму ўбачыць наяўнасць чаргі ў «адным акне», пры неабходнасці прыйсці ў іншы час ці запісацца па электроннай чарзе.

## Плённы абмен думкамі

У ходзе пасяджэння адбыўся ажыўлены і плённы абмен думкамі па тэме пасяджэння. Размова выйшла за межы тэмы раёна і работы яго адміністрацыі з пісьмамі, зваротамі гараджан. Наталля Качанава, іншыя члены Прэзідыума распытвалі сваіх суразмоўцаў, уступалі з імі ў дыскусію.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец спытаўся ў прадстаўнікоў раённай улады і дэпутатаў гарсавета аб магчымых прапановах па ўнясенні карэктыў у законы па рабоце са зваротамі грамадзян.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ паставіла пытанне аб павышэнні выніковасці работы службы 115, на якую паступае шмат скаргаў ад мінчан.

Старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Міхаіл РУСЫ на аснове вывучэння пісьмаў у яго камісію і ў Савет Рэспублікі выйшаў на тэму стварэння камфортных умоў жыцця для шматдзетных сем'яў і людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У прыватнасці, паставіў пытанне аб паскораным будаўніцтве пандусаў каля пад'ездаў, дзе жывуць калясачнікі.

Сваімі ідэямі і прапановамі дзяліліся не толькі супрацоўнікі адміністрацыі Маскоўскага раёна і дэпутаты Мінскага гарадскога Савета.

Актыўна выступаў старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ, кваліфікаваныя тлумачэнні якога па асобных спрэчных пытаннях былі вельмі дарэчы, уносілі яснасць пры абмеркаванні таго ці іншага складанага пытання. Напрыклад, ён паведаміў пра новыя падыходы мінскіх улад да вырашэння такой застарэлай і амаль непад'ёмнай праблемы капітальнага рамонту жылых шматпавярховых дамоў. Дарэчы, паводле слоў Уладзіміра Кухарава, гэта пытанне плануецца разгледзець на пасяджэнні гарвыканкама.

Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ, у прыватнасці, выказаўся на карысць разгляду паўторных скаргаў і пісьмаў ці тых, якія падпісала значная колькасць людзей, абавязкова на месцы, так бы мовіць, «баявых дзеяннях». Толькі там у размове можна напрамую выслухаць зацікаўленых асоб, атрымаць дакладную і аб'ектыўную інфармацыю і потым прыняць узважанае рашэнне.



Фота БелТА.

Паводле звестак Андрэя Бугрова, у гарадскім Савеце ўсе звароты грамадзян улічваюцца, іх аўтары атрымліваюць своечасовыя і кампетэнтныя адказы.

У сваю чаргу, і звароты набываюць нібы новае гучанне: людзі пішуць не толькі пра свае праблемы, яны акцэнтуюць увагу на пытанні агульнага значэння ў розных сферах жыццядзейнасці вялікага горада, звяртаюцца да кіраўнікоў выканаўчай улады са слушнымі прапановамі накont добраўпарадкавання двароў, вуліц, утылізацыі бытавых адыходаў і г. д., сказаў старшыня.

Па выніках абмеркавання ў адміністрацыі Маскоўскага раёна будуць выпрацаваны прапановы па паляпшэнні работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, а таксама рэкамендацыі па яе ўдасканаленні. Таксама ў ходзе пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі быў разгледжаны шэраг актуальных пытанняў, якія патрабуюць хуткага вырашэння.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# СВОЕЧАСОВАЯ І АКТУАЛЬНАЯ ТЭМА

## У Савеце Рэспублікі адбылася нарада спікера верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ са старшынямі абласных і раённых Саветаў дэпутатаў

**Мэта сустрэчы — удасканаленне існуючай сістэмы мясцовага самакіравання, у якой важную ролю адыгрываюць дэпутаты. Гэтая тэма заўсёды была ў полі зроку сенатараў, але цяпер, напярэдадні правядзення VI Усебеларускага народнага сходу, увага да дзейнасці корпуса мясцовых дэпутатаў, іх ролі ў рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады аб'ектыўна ўзрастае.**

Наталля Качанава заўважыла, што пытанне ўдасканалення сістэмы мясцовага самакіравання разглядалася летась у верасні на выязным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі ў Смілавічах, дзе сенатары ўважліва вывучылі асаблівасці дзейнасці сельскіх Саветаў. І тады, паводле слоў спікера, склалася ўражанне, што іх дзейнасць як Саветаў пярвічнага ўзроўню дастаткова эфектыўная. Свае абавязкі сельсаветы выконваюць адказна, непасрэдна ўзаемадзейнічаюць з людзьмі, максімальна садзейнічаюць рашэнню праблем, якія ўзнікаюць у людзей. Гэтая работа сістэмна выбудаваная і досыць эфектыўная. Невыпадкова людзі ў цэлым вельмі пазітыўна ставяцца да дэпутатаў.

Аднак сёння, падкрэсліла Наталля Качанава, узнікла неабходнасць яшчэ раз паглядзець на работу структур мясцовай улады, выслухаць адзін аднаго і прыняць кансалідаванае рашэнне аб тым, як правільна павінна быць выбудавана работа дэпутацкага корпуса ў краіне. Таму спікер заклікала прысутных актыўна, шчыра і адкрыта выказвацца па ўсім комплексе пытанняў, якія датычацца ўдасканалення сістэмы мясцовага самакіравання, падзяліцца сваімі думкамі і прапановамі.

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ паведаміў, што адносна нядаўна ў маштабах вобласці падчас правядзення дыялогавых пляцовак разглядалася работа раённых і сельскіх Саветаў дэпутатаў з актыўным удзелам іх старшынь. Адбыліся сур'ёзныя дыскусіі, прагучалі абсалютна розныя меркаванні. Ва ўсіх была магчымасць выказаць свае думкі, з дыскусій былі зроблены сур'ёзныя высновы. Напрыклад, у абласным Савеце стварылі дзве групы, якія паралельна вывучалі сітуацыю на месцах. Потым на агульнай сустрэчы пасля грунтоўнай размовы прыйшлі да высновы, што дзейнасць сельсаветаў і іх дэпутатаў трэба абавязкова ўдасканальваць у пэўных кірунках.

Старшыня Кармянскага раённага Савета дэпутатаў, дэлегат VI Усебеларускага народнага сходу Таццяна ШЭХЦЕР у размове з журналістамі адзначыла вялікі патэнцыял і значэнне мясцовых Саветаў дэпутатаў у развіцці рэгіёнаў, пашырэнні самазанятасці жыхароў раёнаў, дапамозе ў адкрыцці сваёй справы, падтрымцы мясцовых ініцыятыў. Увогуле Саветы пярвічнага ўзроўню, ці працэй кажучы, сельсаветы, трэба захаваць, лічыць дэлегат.

На думку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіла РУСАГА, сённяшняя нарада своечасовая, бо ў праекце Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на будучую пяцігодку вялікая ўвага надаецца развіццю рэгіёнаў. Таму напярэдадні Усебеларускага народнага сходу вельмі карысна пагаварыць са старшынямі абласных і раённых Саветаў дэпутатаў, пачуць ад іх, якія пытанні неабходна адрэгуляваць, што яшчэ не ўлічана, што турбуе людзей на месцах, сказаў Міхаіл Русы.

Нарада са старшынямі раённых і абласных Саветаў дэпутатаў паказала своечасовасць і актуальнасць пытання, якое было вынесена на абмеркаванне нарады напярэдадні Усебеларускага народнага сходу.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Запрашаем

# ШОУ «ПІН_КОД» ШУКАЕ ВЯДУЧЫХ

**У гэтыя выхадныя рэаліці-шоу «Хачу ў тэлевізар» і маладзёжны інтэрактыўны праект «ПІН_КОД» у эфіры канала «Беларусь 2» правядуць сумесны кастынг на ролю тэлевядучага. Паўдзельнічаць у ім запрашаюць хлопцаў і дзяўчат ва ўзросце ад 16 да 22 гадоў.**



Нагадаем, «Беларусь 2» запусціў рэаліці-шоу «Хачу ў тэлевізар» у 2015 годзе. Яго ўдзельнікі прайшлі школу тэлевядучых «на вачах» усёй краіны, а перамог тады Герман Малышыцкі, які і цяпер працуе вядучым на тэлеканале. Магчымасць паўтарыць поспех Германа і распачаць сваю кар'еру можа кожны — 6 і 7 лютага ў рамках першага тура кастынгу ў студыі Белтэлерадыёкампаніі пройдзе запіс праекта «Хачу ў тэлевізар».

Патрабаванні да прэтэндэнтаў простыя: добрае валоданне мовай і адказнасць, а таксама магчымасць прыязджаць на прамыя эфіры «ПІН_КОДа» і мець час для падрыхтоўкі да праграмы. Вельмі дарэчы будуць вясёлы характар і любоў да тэлебачання. Адабраныя прэтэндэнты ў далейшым працягнуць барацьбу за права весці галоўны маладзёжны праект краіны.

Каб прыняць удзел у кастынгу, трэба папярэдне адправіць заяўку на электронны адрас pincode@tvr.by, пазначыўшы ў ёй свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кантактны нумар тэлефона і невялікае матывацыйнае пісьмо.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 113

Міхаіл Храмцэвіч з Бабруйска заваяваў званне міжнароднага майстра па шахматнай кампазіцыі. Віншуем! А вось адна з яго задач **(гл. дыяграму).**



**Белыя:** Kpf6, Фс6, Лd4, Лd6, Cb8, Cg4, пс2 (7).

**Чорныя:** Kpg3, Kh1, пп. с3, h3, h4, h5 (6).

Мат за 2 хады.

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru**

* * *

Тры свае эцюды, складзеныя сумесна, даслалі нашы чытачы Віктар Жук (Брэст) і Васіль Тупік (Пружанскі раён). Разгледзім іх разам з аўтарскімі рашэннямі.

**№ 1.**

**Белыя:** Kpg2, Ле1, пп. с4, h5 (4).

**Чорныя:** Kph4, Лс3, Kg7 (3).

Выйгрыш.

1. h6 Лс2+ 2. Kpf3 Лс3+ 3. Kpf2 Лс2+ 4. Kpf3 Лс3+ 5. Kpe2 Ke6 6. Лh1+ Kpg5 7. h7 Kf4+ 8. Kpd2 Лd3+ 9. Kpc2 Лd8 10. h8Ф.

**№ 2.**

**Белыя:** Kpg3, Kf2, пп. b6, d3 (4).

**Чорныя:** Kpd4, Cb2, пп. b5, c6 (4).

Выйгрыш.

1. b7 Kpd5 2. Kg4 Ca3 3. Kf6 Kpe6 4. Ke4 Cb2 5. Kg5+ Kpd5 (5...Kpf5 6. Kf3) 6. Kf7.

**№ 3.**

**Белыя:** Kph4, Лg7, Ka3, Kb7, пс5 (5).

**Чорныя:** Kpe8, Лd3, Cf3, пп. c7, f4 (5).

Нічыя.

1. Kb5 Kpf8 2. Л:c7 Лd5 3. Лс8+ Kpg7 4. Лс7+ Kph6 5. Лс6+ Kpg7 6. Лс7+ Kpg6 7. Лс6+ Kpf5 8. K7d6+ Kpf6 9. Ke8+ Kpe7 10. Kf6 Ле5 11. Ла6 Л:c5 12. Kd4 Cc6 13. K:c6+ Kp:f6 14. Kpg4.

* * *

Майстар ФІДЭ з Беларусі Манвел Пагасян выйграў Мемарыял Суэціна, які праходзіў у Туле. А яго калега па званні Дзяніс Лазавік быў чацвёрты на Мемарыяле Маргарана ў сталіцы Арменіі. Вось адна з пераможных партый нашага майстра.

Дзяніс Лазавік — Армен Барсяджан. 1. d4 f5 2. Kf3 Kf6 3. g3 g6 4. Cg2 Cg7 5. 0-0 0-0 6. b3 d6 7. Cb2 c6 8. c4 a5 9. Kc3 Ka6 10. Ле1 Фс7 11. e4 fe 12. K:e4 K:e4 13. Л:e4 Cf5 14. Ле3 Лae8 15. h3 a4 16. g4 Cc8 17. Фе2 e6 18. Ле1 Фd8 19. Ле4 ab 20. ab b6 21. Cc1 c5 22. d5 e5 23. Kh2 Kc7 24. Kf1 Cf6 25. Ch6 Лf7 26. Фd2 Ch4 27. Ce3 h6 28. Kg3 Cg5 29. C:g5 hg 30. Л4е2 Ka6 31. Ke4 Лf4 32. Ла1 Фе7 33. Ла4 Cb7 34. Ле1 Леf8 35. Леа1 Kc7 36. Ла7 Ke8 37. Лf1 Л8f7 38. b4 Фd8 39. Лb1 Cc8 40. Ла8 Kpg7 41. bc dc 42. Фb2 Л:e4 43. C:e4 Kd6 44. Ф:e5+ Kph6 45. Cd3 Ле7 46. Фс3 Kf7 47. Ле1 Л:e1+ 48. Ф:e1, 1:0.

Наступная партыя паміж двума беларускімі шахматыстамі згуляна на турніры ў Чэлябінску.

Аляксей Аляксандраў — Вячаслаў Зарубіцкі. 1. Kf3 d5 2. e3 Kf6 3. c4 c6 4. Kc3 g6 5. d4 Cg7 6. Cd3 0-0 7. 0-0 Cg4 8. h3 C:f3 9. Ф:f3 Ле8 10. Лd1 e6 11. e4 de 12. C:e4 Kbd7 13. Cc2 e5 14. d5 cd 15. cd Лс8 16. d6 b5 17. Фе2 a6 18. a4 b4 19. Ke4 Лс6 20. a5 Kc5 21. K:c5 Л:c5 22. Ce3 Л:a5 23. d7 Лf8 24. Л:a5 Ф:a5 25. Фс4, 1:0.

* * *

Рашэнне задачы А. Варыцкага з мінулага выпуску: 1. Фh5!; кампазіцый С. Дарошчанкі: № 1. 1. Cb8; № 2. 1. Лf8; № 3. 1. c7. Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Васіль Жуковіч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**







Далучайцеся!

# Чакаем прозу — цікавую і розную!

## Пачынаецца новы сезон конкурсу апавяданняў

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ



*«Магутнае слова, ты, роднае слова!*
*Са мной ты на яве і ў сне;*
*Душу мне затрэсла пагудкаю новай,*
*Ты песень навучыла мяне», —*
пісаў калісьці вялікі Янка Купала.

**З тых часоў роднае, беларускае слова «песень навучыла» тысячы паэтаў і пісьменнікаў. Кожны год на айчынную ніву прыгожага пісьменства, нягледзячы ні на якія варункі, прыходзяць новыя і новыя аратыя ды сейбіты, а тыя, хто прыйшоў да іх, працягваюць работу. А што на той ніве адбываецца, паказвае ў тым ліку і традыцыйны конкурс апавяданняў газеты «Звязда». Толькі што мы падвялі вынікі мінулага сезона, а цяпер запрашаем усіх ахвотных узяць удзел у новым: паэксперыментаваць з «пагудкаю новай» альбо працягнуць «старую каляіну» — на ваш выбар. Пра конкурс і яго ўмовы мы гутарым з ягоным куратарам, дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура», паэтам, пісьменнікам, перакладчыкам Алесем БАДАКОМ.**

— Адразу скажу дэбютантам: не бойцеся дасылаць нам свае творы! — гаворыць Алесь Мікалаевіч. — У конкурсе заўсёды ўдзельнічалі як прызнаныя майстры, той жа народны пісьменнік Іван Шамякін, так і тыя, хто шырокаму колу чытачоў зусім невядомы. Нават школьнікі, успомніць Марыну Яўсейчык, якая вучылася ў дзясятым класе, калі стала пераможцай нашага конкурсу. І канешне, за ўвесь гэты час з'явіліся пэўныя традыцыі, у першую чаргу дзякуючы самім канкурсантам. Недарэмна гэты конкурс часам называюць народным.

***— Але ж адбіраюць пераможцаў менавіта прафесіяналы?***

— На выніку ўплываюць не толькі меркаванні прафесійнага журы, але і водгукі чытачоў. Так што заклікаю ўсіх неабыякавых яшчэ больш актыўна ўдзельнічаць у абмеркаванні твораў канкурсантаў. Тым больш што кожны знойдзе тут нешта на свой густ. Пераможцы ілюструюць сваёй творчасцю самыя розныя стылі і кірункі беларускай літаратуры. Гэта і апавяданні, напісаныя ў традыцыйным рэчышчы, і «пошукавыя» рэчы, асабліва калі мы гаворым пра маладых удзельнікаў. Мяне вельмі цешыць, што кожны год у конкурсе адкрываюцца новыя імёны. Узнікае пачуццё, што ўсе мы — і аўтары, і чытачы — робім адну вялікую справу на карысць нашай літаратуры. Усе тэндэнцыі сучаснай беларускай прозы можна прасачыць па «звяздоўскім» конкурсе.

***— Але паміж «эксперыментатарамі» і «традыцыяналістамі» заўсёды адбываліся нейкія спрэчкі, пэўнае супрацьстаянне...***

— На сённяшні дзень гэта неактуальна. Сучасная беларуская літаратура вельмі разнастайная, шматжанравая. Мне здаецца, што вялікага спаборніцтва паміж тымі, хто спрабуе прыўнесці ў яе нейкія новыя плыні, кірункі, і тымі, хто працуе ў традыцыйным рэчышчы, няма. Мы бачым нават па выніках конкурсу, што перамагаюць вельмі часта адначасова і першыя, і другія. Усё таленавітае — на карысць беларускай прозы.

***— Паралельна са з'яўленнем новых імёнаў відавочна, што склалася кола аўтараў, якія рэгулярна бяруць удзел у конкурсе «Звязды»... Сярод іх шмат жыхароў рэгіёнаў.***

— Сапраўды, конкурс «Звязды» ахоплівае ўсю Беларусь. І добра, што ёсць аўтары, якія дасылаюць нам свае творы штогод, не здаюцца, нават калі не перамагаюць. Але сярод такіх заўсёднікаў ёсць і неаднаразовыя пераможцы. Гэта таксама для мяне вялікае задавальненне. Бо часам, калі параўнаць, што яны дасылалі, калі ўпершыню ўдзельнічалі ў конкурсе і цяпер, відаць, як за гэты час вырасла іх майстэрства. Нашы неаднаразовыя пераможцы ці фіналісты — звычайна людзі, якія з'явіліся сярод удзельнікаў яшчэ ў якасці непрафесійных пісьменнікаў, вельмі часта — пачаткоўцаў, а цяпер — вядомыя літаратары. Так што «звяздоўскі» конкурс выступае яшчэ і ў ролі літаратурнай школы.

***— Мы гаворым пра традыцыі... Але ж, напэўна, ёсць і змены.***

— Канешне, і найперш гэта датычыцца саміх твораў, на якія ўплывае эпоха, бо з'яўляюцца новыя рэаліі і, адпаведна, новыя тэмы. Тое, што прыходзіць на «звяздоўскі» конкурс цяпер, гэта літаратура, якая магла нарадзіцца толькі ў XXI стагоддзі. І не выключна з-за дэталяў кшталту згадак пра розныя гаджэты. Гэта адчуваецца і па стылі, і па сюжэтах. Героямі часта робяцца не толькі беларусы, але і прадстаўнікі іншых краін свету, а героі-суайчыннікі шмат падарожнічаюць. Праўда, цяпер мы перажываем эпоху пандэміі, калі паездкі прыпыніліся, — і ўпэўнены, рэаліі і гэтай эпохі таксама адлюструюцца ў творах, якія нам яшчэ дашлюць.

***— Ці зменяцца на наступны сезон умовы конкурсу?***

— Не. Галоўнае пажаданне — каб нашы аўтары прытрымліваліся фармату: апавяданне не павінна быць больш чым на газетную паласу. Заўсёды бывае цяжка адмаўляць аўтарам, якія прысылаюць добрае апавяданне, але памерам ледзь не ў друкарскі аркуш. Таму што скарачаць твор — гэта ўжо выходзіць за рамкі конкурсных умоў. Ды і аўтарам заўсёды непрыемна, калі скарачаюць іх «дзецішча» толькі таму, што апошняе не ўваходзіць у фармат. Карацей, пішыце, эксперыментуйце, шукайце. Усім жадаю поспехаў!

### Нагадваем шаноўным чытачам

**Дасламь сваё апавяданне можна ў электронным выглядзе на пошту info@zviazda.by альбо на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013, з пазнакай «На літаратурны конкурс» і звесткамі пра сябе. Вы мусіце паведаміць сапраўдныя прозвішча і імя, дакладны паштовы адрас, кантактны тэлефон і поўныя пашпартныя даныя — нумар, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар (гэта для ганарару).**

**Да творчага спаборніцтва прымаюцца творы на беларускай мове, якія раней нідзе не друкаваліся, аб'ёмам да 10—12 тысяч знакаў. Звярніце таксама ўвагу, што разглядаецца толькі адно апавяданне ад аднаго аўтара. Найлепшыя творы ўбачаць свет на старонках «Звязды». З ліку апублікаваных аўтараў і будуць абраныя лаўрэаты.**

**Чакаем вашых апавяданняў, цікавых і розных!**

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## Беларусь 1

**6.00 Меладрама «Сашына справа». 3-я і 4-я серыі (16+).**
7.55 Клуб рэдактараў (16+).
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.40 Гісторыі выратавання (12+).
10.15 «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
10.45 Маршрут пабудаваны (12+).
**11.20, 12.35 Меладрама «Дочкі-маці» (16+).**
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
13.35 «Я ведаю» (6+).
15.15 Дай пяць (6+).
15.30 Вакол планеты.
16.15 Адзін дзень (12+).
**16.50, 19.10 Меладрама «Хачу быць шчаслівай» (12+).**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
**22.05 Меладрама «Кошык для шчасця». 1—4-я серыі (16+).**

## Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
8.00, 19.45 Тэлебарометр.
**8.05 «Клон». Серыял (16+).**
9.50 «Тры першыя спатканні» (16+).
**10.40 Баявік «Жывая сталь» (12+).**
12.40 «На нажах» (16+).
13.40 «Тата лапаў» (16+).
15.25 «Мяняю жонку» (16+).
17.15 «Вежа» (12+).
**18.05 Баявік «Адчайныя» (12+).**
20.15 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
21.10 Спортлата 5 з 36, КЕНА.
**21.20 Камедыя «Холмс і Ватсан» (12+).**
22.55 «Каханне на выжыванне» (16+).

## Беларусь 3

7.30 «Святыні Беларусі».
8.00, 13.45 Навіны культуры.
8.20 «Казка аб мёртвай царэўне і аб сямі волатах». М/ф (0+).
**8.50 «Кухарка». Маст. фільм (12+).**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.25 «Беларуская кухня». Стромга з яблыкамі.
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
11.45 «Народны майстар». Марына Вакульчык (шкрабанка).
12.15 «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
12.50 Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча «Вінілавыя джунглі».
14.05 «Мой тата — Юрый Цвяткоў». Дак. фільм.
14.55 Канцэрт [СЦ].
16.40 «Гукі ў футурале». Электрагітара.
**17.05 «Піраты ХХ стагоддзя». Маст. фільм (12+).**
**18.30 «Непапраўны лгун». Маст. фільм (6+).**
19.50 «Кадры жыцця». Рэжысёр, пісьміннік Уладзімір Мароз.
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Інспектар Лосеў». Маст. фільм (12+) [СЦ].**

## Беларусь 5

7.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Беларусі ў памяшканні.
9.00 Сняданак чэмпіёнаў.
9.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі.
11.25 Біятлон. Чэмпіянат свету. Паклюка. Спрынт. Жанчыны.
12.50 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — БЧ (Гомель).
14.55 Спорт-мікс.
15.05 Біятлон. Чэмпіянат свету. Паклюка. Гонка пераследу. Мужчыны.
15.55 Вось гэта спорт!
16.10 Футбол. На шляху да Еўра-2020. Відзачасопіс.
16.45 Піт-стоп.
17.20 Біятлон. Чэмпіянат свету. Паклюка. Гонка пераследу. Жанчыны.
18.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вэст Бромвіч» — «Манчэстэр Юнайтэд».
19.10 Спорт-цэнтр.
19.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Лідс». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.20 Вынікі тыдня.
22.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Эвертан» — «Фулхэм». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 [СЦ] Нашы навіны.
7.10 «Здароўе» (16+).
8.10 «Жыццё іншых» (12+).
9.10 «Метэагід».
9.30 «Тэорыя змовы» (16+).
10.20 «Народны кухар» (12+).
**11.40 Серыял «Гэта асабістыя абставіны» (16+).**
13.30 «Ці бачылі відэа?» (6+)
15.00 «Мікалай Яроменка. На разрыў сэрца» (16+).
16.20 «Я амаль знакаміты» (12+).
17.40 «Лепш за ўсіх!» (6+)
19.10, 21.20 «Кропля ў кроплю» (16+).
20.00 «Контуры».
23.15 «Спартклуб» (16+).
23.35 «Іх Італія» (16+).

## СТБ

6.35 «Таямніцы Беларусі».
8.30 Дак. праект (16+).
9.00 «Мінтранс» (16+).
9.55 «Скардзіцца дазваляецца».
10.25 «Вялікі горад».
**10.55, 13.40, 16.40 «Меч-2». Серыял (16+).**
13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
21.20 Дак. спецпраект (16+).
23.00 «Засакрэчаныя спісы» (16+).
1.20 «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Новыя амазонкі» (16+).**
6.10 М/ф (0+).
**6.25 Маст. фільм «Начное здарэнне» (16+).**
8.15 «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
8.50 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові». Ганна Герман (12+).
9.25 «ФазэндаЛайф» (12+).
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.10, 16.15, 19.30 Серыял «Ганна Герман. Таямніца белага анёла» [СЦ] (16+).**
18.30, 0.00 Выніковая «Разам».
**22.45, 1.00 Серыял «Метад Фрэйда» [СЦ] (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.05 Серыял «Трымайся за аблокі» (12+).**
**11.00 Драма «Знайдзі нас, мама!» (12+)**
14.40 «Парад гумару» (16+).
**16.00 Серыял «Чужая» (12+).**
20.00 Весткі тыдня.
21.05 «У людзях».
21.30 «Таямніцы Беларусі» (16+).
22.25 Масква. Крэмль. Пуцін.
23.05, 0.50 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».
0.10 «Дзеючыя асобы».

## НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.10 Элементарыум. (6+).
6.45 Беларусы (6+).
7.20 «50 рэцэптаў першага» (12+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «24 пытанні» (12+).
8.45 «Гарады Беларусі» (6+).
9.20 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
10.20 «Кватэрнае пытанне. Ву» (12+).
10.50 «Першая перадача» (16+).
11.20 «Цуд тэхнікі» (12+).
12.10 «Дачны адказ» (0+).
13.05 «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.00 Драма «Ваўчынае сонца» (16+).**
16.20 «Следства вялі...» (16+)
18.00 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
19.00 «Вынікі тыдня».
20.05 «Зоркі сышліся» (16+).
21.25 «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
21.55 «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).

## 8 канал

7.00, 13.15, 17.35, 20.00, 21.00 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05, 15.15 «Мультпарад». «Лэдзі і валацуга» (6+).
8.20 «Прыколы 13-й школы» (6+).
**8.25 Камедыя «Амерыканская дачка» (12+).**
10.00 «Б'юці-дзень».
10.30 «Гатуй як шэф» (12+).
10.50 Прыгоды «Ціхаакіянскі рубеж» (12+).
**13.20 «Глядзім усёй сям'ёй». «Сястрычка» (6+).**
15.15 «Мультпарад». «Таямніца Како» (12+).
17.00 «Водары кантонскай кухні».
**17.40 Драма «Зялёная карэта» (16+).**
19.15 «Суперлато».
**20.05 Серыял «Праект «Сіняя кніга» (16+).**
20.50 «Вечарніца» (6+).
**21.10 Драма «Слаўныя хлопцы» (16+).**
**23.40 Вестэрн «Цудоўная сямёрка» (16+).**
1.55 «Надвор'е».



## ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.00 Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
10.35 «Наш рамонт» (16+).
11.10 Скетч-шоу «Зала чакання» (16+).
12.00, 23.00 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
13.00 «Вакол свету пад час дэкрэта» (12+).
15.50, 1.50 Серыял «Пакуль цвіце папараць» (16+).
16.55 «Уральскія пельмені» (16+).
18.30 Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
20.30 Серыял «Івановы-Івановы» (16+).
21.30 Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
0.05 Серыял «Новы чалавек» (16+).
1.00 Серыял «Людзі Хэ» (16+).
2.40 Серыял «Татавы дочкі».
3.55 Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 Скетч-шоу «6 кадраў».

## Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква Гіляроўскага.
7.05 «Іншыя Раманавы». «Тэорыя разумнага эгаізму» [СЦ].
7.35, 18.40, 23.50 «Сапраўдная вайна прастолаў». Д/с [СЦ].
8.20 Легенды сусветнага кіно. Барыс Барнет.
8.50, 16.35 «І гэта ўсё пра яго». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.35 ХХ стагоддзе. «Андрэй Вазнясенскі. Вечар у Канцэртнай студыі «Астанкіна».
12.25 «Вылечванне храма». Дак. фільм [СЦ].
13.10 Лінія жыцця. Еўдакія Германава [СЦ].
14.10 Колер часу. Аловак.
14.15 Дзень беларускай навукі. «Аляксей Ляпуноў. Твар дваранскага паходжання». Дак. фільм.
15.05 Навіны. Падрабязна. АРТ.
15.20 «Агора». Ток-шоу.
16.20 Прыгожая планета. «Польшча. Гістарычны цэнтр Кракава».
17.45, 1.45 Гістарычныя канцэрты. Піяністы. Навум Штаркман.
19.45 Галоўная роля.
20.05 «Правілы жыцця».
20.35 «Дзмітрый Мендзялееў. Запаветныя думкі». Дак. фільм.
21.30 «Сацы. Нясумная класіка...»
22.10 «Белая гвардыя». Маст. фільм. 1-я серыя [СЦ].
23.00 «Рассакрэчаная гісторыя». Д/с [СЦ].
2.40 Колер часу. Эдвард Мунк. «Крык».

## Настальгія

6.00 Маст. фільм «Дзівак-чалавек» (12+).
7.00, 8.45, 11.20, 21.40, 23.00, 1.00, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.15 «Вакол смеху». 1990 год (12+).
9.00 «Быў час». 2009 год (16+).
10.00 «Праграма А». 1990 год (12+).
12.00 Фільм-спектакль «Вялікая магія». 1980 год (12+).
14.25 «Сумаваць не трэба». Фільм-канцэрт. 1985 год (12+).
15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
15.40 Маст. фільм «Сын» (16+).
18.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Паэзія андэграўнду». 2005 год (18+).
19.00 Фільм-канцэрт «Рытм, рытм, рытм». 1979 год (12+).
19.25 «Тэатральныя сустрэчы». 1977 год (12+).
22.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
0.00 «Да і пасля...» Год 1992-і. 2-я частка. 2010 год (16+).
1.15 Маст. фільм «Вязень замка Іф» (16+).
2.50 Мультфільм «Трам! Прывітанне!» 1980 год (6+).
4.00 «Колба часу» (16+).
5.10 Дак. фільм «Дзеці ХХ з'езда». Трэцяя серыя «Урокі». 1989 год (12+).

## EuroSport 1

0.00 Снукер. Shoot-Out.
2.00, 19.00 Тэніс. Australian Open — 2020. Агляд (6+).
3.00 Тэніс. Australian Open.
16.30, 21.00 Горныя лыжы. Чэмпіянат свету.

## Кінакамедыя

1.00 Муві 43 (18+).
3.15 Асаблівасці нацыянальнага палявання (16+).
5.05 Усё ці нічога (16+).
6.45 Правілы здыму: метад Хітча (12+).
8.55 Таксі-5 (18+).
10.50 Эддзі (12+).
12.40 Вірус любові (18+).
14.20 Суперстар (16+).
16.00 Бандыткі (16+).
17.40 Раство з няўдачнікамі (16+).
19.30 Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара (12+).
21.30 Ананасавы экспрэс: сяджу, куру (18+).
23.40 Апошнія дзяўчаты (16+).

## ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
10.40 «M&S» (12+).
11.10, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
12.15 «Перыскоп» (16+).
12.40 «Лепшы сабака».
13.35 «Новы дзень» (16+).
14.10 «Паглядзім» (12+).
14.45 «Сола на саксафоне». Маст. фільм (16+).
16.50 «Чалавек-невідзімка» (16+).
17.55 «Паралельны свет» (12+).
19.00 «Жанчыны» (16+).
19.55 «Скажы мне праўду» (16+).
21.00 «Відавочцы» (16+).
21.40 «Якія вярнуліся» (16+).
22.45 «Косці». Серыял (16+).
0.35 «Грым». Серыял (16+).
1.30 «Акцёрскія драмы» (12+).
2.20 «Шалёнае вяселле». Маст. фільм (12+).
4.00 «Сляпая» (16+).

## ТБ1000

5.30 Ультрафіялет (16+).
7.00 Зялёны Шэршань (12+).
9.10 Затура: касмічнае прыгода (12+).
11.00 Прывідны патруль (12+).
12.40 Сэрцаед (16+).
14.35 Як пазбавіцца ад хлопца за 10 дзён (12+).
16.40 Абуджэнне (6+).
19.00 Гульні розуму (16+).
21.15 Прыстанак пракля-тых (16+).
23.20 Прывід дома на ўзгорку (16+).
1.15 Пампушка (16+).
3.10 Іспанская-англійская (16+).

## ТБ1000 Руская кіно

5.30 Бабло (16+).
7.05 Пікавая дама: Чорны абрад (16+).
8.40 Пікавая дама: Залюстроўе (16+).
10.05 Прайгранае месца (16+).
11.55 Світанак (16+).
13.35, 19.00 Аперацыя «Сатана» (16+).
15.35 30 спатканняў (16+).
17.15 Ключ часу (12+).
20.55 Мужчына з гарантыяй (16+).
22.25 Пацалунак скрозь сцяну (16+).
0.10 Гараскоп на ўдачу (12+).
2.00 Дзяўчаты бываюць розныя (16+).
3.40 Гудбай, Амерыка (12+).

## National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.45, 13.25, 22.40, 1.55 Аўта-SOS (16+).
7.35, 10.55 Інстынкт выжывання (16+).
8.20 Ледзяная дарога (16+).
9.10 Машыны: разабраць і прадаць (16+).
10.00 Зрабіць за адзін дзень (16+).
11.45 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
12.35, 16.50 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
14.15, 21.00 Ліхтугі за мяжой (16+).
15.05, 19.20, 0.20 Расследаванні авіякатастроф (16+).
15.55, 5.10 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
17.40 Падарожжы з Гардэнам Рамзі (16+).
18.30 Фабрыка ежы (16+).
21.50, 3.30 Кантрабанда з Мар'янай ван Зелер (16+).
23.30 Гульні розуму (16+).
1.10, 4.20 Асушыць акіян (16+).

## Discovery

8.00 Чыгунка Аўстраліі (12+).
8.45 Паляўнічыя на склады (16+).
9.35, 17.12, 22.18 Круты цюнінг (12+).
10.25 Іржавая імперыя (12+).
11.15 Як гэта ўладкавана? (12+)
12.06, 19.45, 4.10 Махінатары (12+).
12.57, 3.24 Узрываючы гісторыю (12+).
13.48 Мільярдэр пад прыкрыццём (12+).
14.39 Сямейка Осбарнаў — праўда ці хлусня (16+).
15.30 Як пабудаваць... Што заўгодна (12+).
16.21, 1.42 Музейныя загадкі (12+).
18.03 Выгадная старызна (12+).
18.54, 2.33 Чыгунка Аляскі (12+).
20.36 Майстры патаргавацца (16+).
21.27 Зроблена з другасной сыравіны (12+).
23.09 Склады: бітва ў Канадзе (12+).
0.00 Аўтасвет Майка Бруера (12+).
0.26 Супермеханік Энт Энстэд (12+).
0.51 Жаночая аўтамайстэрня (12+).
4.56 Як гэта зроблена? (16+)
5.42 Утыльшчыкі (12+).
6.28 Голыя і напалоханыя (16+).
7.14 Аляска: апошні рубеж (16+).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**8.05** Зразумелая палітыка.
**9.10, 22.45 Серыял «След» (16+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Меладрама «Вяртанне» (16+).**
**13.55** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.40, 15.25 Меладрама «Выпрабаванне» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.50** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка плюс.
**0.30** Сфера інтарэсаў.
**1.15** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 16.25** Тэлебарометр.
**9.05, 20.15 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.05, 22.25** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00, 18.20 Дэтэктыў «Унутры» (16+).**
**12.55** М/с «Пінгвіны з Мадагаскара» (0+).
**13.20** «Да пабачэння» (16+).
**14.10** «Камень, нажніцы, папера».
**14.45, 23.25 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**
**15.40** Нічога сабе ньюс (12+).
**15.45** «ПІН_КОД» (12+).
**16.30 «Клон». Серыял (16+).**
**17.25** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.25** «Паненка-сялянка» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня». Клёцкі па-карэліцку.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.55** Навіны культуры.
**8.25, 18.15 «Катоўскі». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**9.55** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**10.20 «Маладая жонка». Маст. фільм (12+).**
**12.45** «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
**13.30** «Легенды кіно». Уладзімір Зельдзін (12+).
**14.05, 21.40 «Ваенная разведка. Паўночны фронт». Фільм другі «Белы ліс». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**15.55** «Кадры жыцця». Сцэнарыст, рэжысёр, прадзюсар, паэт, мастак, педагог Аляксандр Карпаў.
**16.50 «Свінарка і пастух». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**19.50** «Камертон». Народны артыст Беларусі Юрый Траян.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** «Апошні дзень». Люсьена Аўчыннікава (12+).
**23.30** «Нататкі на палях». Францішак Багушэвіч: бацька і дзеці [СЦ].

## Беларусь 5

**7.00** Спорт-мікс.
**07.10** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. ПСЖ (Францыя) — «Вардар» (Паўночная Македонія).
**8.45** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. ВРЗ (Гомель) — «Дынама-БНТУ» (Мінск).
**10.50** Матч-пойнт.
**11.20** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Барселона» (Іспанія) — «Веспрэм» (Венгрыя).
**12.55** Грэка-рымская барацьба. Чэмпіянат Беларусі.
**14.20** Фрыстайл. Чэмпіянат свету.
**15.50** Спорт-кадр.
**16.20** Агнявы рубеж.
**16.50, 22.45** Біятлон. Чэмпіянат свету. Паклюка. Змешаная эстафета.
**18.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**19.20** На шляху да Токіа. Відэачасопіс.
**19.55** Слэм-данк.
**20.25, 22.35** Спорт-цэнтр.
**20.35** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Матор» (Украіна) — «Кіль» (Германія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.15** Між іншым.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.55** Нашы навіны.
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.00** Нашы навіны.
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 22.10 Фільм «Марафон» (16+).**
**15.10** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.05** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** Удача ў прыдачу! Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «За першага сустрэчнага» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.05** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Таямніцы Беларусі».
**11.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.35, 21.00, 0.50** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.15** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.45, 16.50 «Меч-2». Серыял (16+).**
**20.30, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45** «Міншчына».
**22.00** «Глядзець усім!» (16+)

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Знайсці мужа Дар'і Клімавай» (12+).**
**05.25 Серыял «Застава Жыліна». 1—4-я серыі (16+).**
**8.40, 10.10, 18.00, 19.25 Серыял «Порах і дроб» [СЦ] (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.15, 2.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 3.00** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** Міравое пагадненне (16+).
**21.40** «Гульня ў кіно» (12+).
**22.25** «Назад у будучыню» (12+).
**23.25** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.15 Маст. фільм «Чатыры таксісты і сабака» (16+).**
**3.50 Маст. фільм «Крымінальныя абставіны» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае». Токшоу (12+).
**12.35 Серыял «Трымайся за аблокі» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны—Беларусь.
**14.40 Серыял «Марозава» (12+).**
**17.15** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.55** «Андрэй Малахаў. Няхай гавораць» (16+).
**21.05 Серыял «Скліфасоўскі» (16+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.20, 16.20, 19.35, 21.55, 23.20** Сёння. Галоўнае.
**6.15** Спорт-мікс.
**6.25** Беларусы (6+).
**7.15** «Здароўе» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.30** Сфера інтарэсаў.
**8.55** «Навукаманія» (6+).
**9.25, 22.00** «НЗ.by».
**9.45, 10.20 Серыял «Бачу-веданю» (16+).**
**12.00, 13.45 Серыял «Пчаляр» (16+).**
**13.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.25** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00 Серыял «Добрая жонка» (16+).**
**19.50 Дэтэктыў «Балабон-2» (16+).**
**22.15 Серыял «Шпіён № 1» (16+).**
**23.35** Справа ўрачоў (16+).

## 8 канал

**7.00, 15.00, 18.10, 1.25** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.10** «Мультпарад». «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (6+).
**7.30, 15.05, 20.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).**
**8.20, 19.20 Серыял «Тэрыторыя» (16+).**
**09.15 Меладрама «Зімовая вішня» (12+).**
**10.45** «Дзеці пра ежу» (6+).
**11.15 Драма «Ледакол» (12+).**
**13.20 Серыял «Неўтаймоўны валадар» (16+).**
**14.05** Дак. фільм «Экспедыцыя да Эверэста» (12+).
**16.30 Серыял «Леднікаў» (16+).**
**18.15 Серыял «Прывіды сядзібы Блай» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (6+).
**21.15 Трылер «Анёлы і дэманы» (12+).**
**23.30 Трылер «Грань будучыні» (12+).**



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.00, 14.00** Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
**10.35** Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
**12.05** «Лаві момант» (16+).
**13.20** «Наш рамонт» (16+).
**15.50** Шоу «Стэндап андэграўнд» (16+).
**16.55, 23.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**18.30** Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
**20.30** Шоу «Руския не смяюцца» (16+).
**21.30** Серыял «Івановы-Івановы» (16+).
**0.55** Скетч-шоу «Нерэальная гісторыя» (12+).
**2.40** Серыял «Таты дочкі».
**3.55** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**4.45** Скетч-шоу «6 кадраў».

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.15** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква рамантычная.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**8.20** Легенды сусветнага кіно. Леанід Абаленскі.
**8.45** «Мы, ніжэйпадпісаныя». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Старадаўні вадзэвіль». Маст. фільм.
**11.25** Больш, чым каханне. Ганна Паўлава.
**12.10** Адкрытая кніга. Міхаіл Візель. «Пушкін. Болдзіна. Каранцін. Хроніка самаізаляцыі 1830 года» [СЦ].
**12.40** «Белая гвардыя». Маст. фільм [СЦ].
**13.30** Улада факта.
**14.15** «Яўген Чазаў. Воляю лёсу». Дак. фільм.
**15.05** Лісты з правінцыі. Курск [СЦ].
**15.35** «Энігма». Айдар Гайнулін.
**16.15** Раман у камені. «Шры-Ланка. Маўнт Лавінія». Дак. фільм.
**16.40** «Чалавек, які сумняваецца». Маст. фільм [СЦ].
**18.05** Гістарычныя канцэрты. Піяністы. Уладзімір Крайнеў.
**18.40** «Падарожжа ў дзяцінства». Дак. фільм [СЦ].
**19.45** «Смеханастальгія».
**20.15** Лінія жыцця. Аляксандр Румянцаў [СЦ].
**21.10** «Карусель». Маст. фільм [СЦ].
**22.15** «2 Вернік 2». Марына Нявёлава.
**23.35** «Разамкнутыя абдымкі». Маст. фільм.
**1.40** «Мудрасць кітоў». Дак. фільм [СЦ].
**2.30** «Шут Балакіраў», «Кот і Ко». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. 2007 год (12+).
**7.00** Спектакль «Марат, Ліка і Леанідзік». 1971 год (16+).
**8.45, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 19.05, 20.40, 21.40, 23.00, 1.00, 2.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Ялавая сумбарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока» (16+).
**13.05** Фільм-спектакль «Сваякі». 1981 год (16+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. 2010 год (16+).
**19.20** Тэлеспектакль «Звычайныя абставіны». 1981 год (16+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Бізнесмены, яднайцеся!» 2006 год (16+).
**1.30** Тэлеспектакль «Альманах сатыры і гумару». 1980 год (12+).

## EuroSport 1

**0.00, 19.15** Тэніс. Australian Open (6+).
**16.30, 21.00** Біятлон. Чэмпіянат свету. Паклюка. Мужчыны. Спрынт.
**17.50, 22.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**23.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету (12+).

## Кінакамедыя

**1.35** Ананасавы экспрэс: сяджу, куру (18+).
**4.05** Злавесныя мерцвякі-3: армія цемры (16+).



**5.40** Бандыткі (16+).
**7.20** Раство з няўдачнікамі (16+).
**9.10** Хто я? (12+)
**11.25** Каханне здараецца (16+).
**13.25** Рыбка па імені Ванда (16+).
**15.25** Астэрыкс і Абелікс: місія Клеапатра (12+).
**17.35** Падмена (16+).
**19.30** Дзень радыё (16+).



**21.25** Вышэйшая ліга-2 (12+).
**23.20** Вірус любові (18+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.35** «Паглядзім» (12+).
**10.10, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.10, 17.35** «Сны» (16+).
**12.10, 18.35, 2.45** «Сляпая» (16+).
**13.15** «Варажбітка» (12+).
**14.20, 3.40** «Містычныя гісторыі» (12+).
**15.25** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.00** «Ведзьмакі свету» (16+).
**17.00** «Знакі лёсу» (16+).
**19.45** «Знахаркі» (16+).
**20.50** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**21.55** Камедыя «Стажор» (16+).
**0.10** «Іншы свет-2». Маст. фільм (18+).
**1.55** «90-я» (16+).

## ТБ1000

**5.00, 14.50** Зялёны Шэршань (12+).
**7.00** Жарты ў бок-2: Місія ў Маямі (16+).
**9.00** Васабі (16+).
**10.40** Вострау галаварэзаў (6+).
**13.00** Джуманджы (6+).
**17.00, 3.35** Век Адалін (16+).
**19.00** Нявеста, якая збегла (16+).
**21.05** Рэальнае каханне (16+).
**23.35** Якія не спяць у Сіэтле (6+).
**1.30** Простая просьба (18+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Ключ часу (12+).
**7.10** Аднакласнікі.ru: НаCLICKай удачу (12+).
**8.55** Наша Russia. Яйкі Лёсу (16+).
**10.30** Той яшчэ...! (12+)
**12.00** Пацалунак скрозь сцяну (16+).
**13.35** Паўночнае ззянне. Ведзьміны лялькі (16+).
**15.15** Ржэўскі супраць Напалеона (16+).
**16.55** Канікулы строгага рэжыму (12+).
**19.00** Паўночнае ззянне. Шоргат крылаў (12+).
**20.45** СуперБабровы (12+).
**22.30** СуперБабровы. Народныя мсціўцы (12+).



**0.05** Лаві момант (16+).
**1.35** Джэнтльмены, удачы! (12+)
**3.30** Мне не балюча (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.45, 13.25, 22.40** Аўта-SOS (16+).
**7.35** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**8.25** Ледзяная дарога (16+).
**9.15** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**10.05** Супербудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**10.55** Экстрэмальнае падарожжа: Другая сусветная вайна (16+).
**11.45** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**12.35, 15.05, 16.50,19.20, 0.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**14.15** Ліхтугі за мяжой (16+).
**16.00, 5.00** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**17.40** Падарожжы з Гордaнам Рамзі (16+).
**18.30** Фабрыка ежы (16+).
**21.00, 3.25** Індыя з вышыні птушынага палёту (16+).
**23.30** Гульні розуму (16+).
**1.05, 4.10** Асушыць акіян (16+).

## Discovery

**8.00, 18.54, 2.56** Чыгунка Аляскі (12+).
**8.45** Склады: бітва ў Канадзе (12+).
**9.35, 17.12** Круты цюнінг (12+).
**10.25** Іржавая імперыя (12+).
**11.15** Зроблена з другаснай сыравіны (12+).
**12.06, 22.18, 4.33** Махінатары (12+).
**12.57, 3.47** Узрываючы гісторыю (12+).
**13.48, 7.14** Залатая ліхаманка (16+).
**14.39, 0.00** Аляска: апошні рубеж (16+).
**15.30** Як гэта ўладкавана? (12+)
**16.21, 2.05** Музейныя загадкі (12+).
**18.03** Паляўнічыя на склады (16+).
**19.45** Мяцежны гараж (12+).
**20.36, 5.42** Майстры патаргавацца (12+).
**21.27, 5.19** Як гэта зроблена? (12+)
**23.09** Склады: бітва ў Канадзе (12+).
**0.51, 6.28** Голыя і напалоханыя (16+).

АКТУАЛЬНА

# НЕ ЗАКРЫВАЦЬ, А РАЗВІВАЦЬ І ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ

## Стацыянарныя аб'екты гандлю на вёсцы нішто не заменіць. Так лічыць старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ

**У сельскай мясцовасці жыхары не маюць такога доступу да ўсіх выгод цывілізацыі, як гараджане. У маланаселеных вёсках закрываюцца стацыянарныя магазіны. Яны эканамічна стратныя, паколькі немалыя выдаткі ідуць на аплату камунальных паслуг, электраэнергію, зарплату прадаўцу, вартаўніку.**



— Канешне, кожны кіраўнік суб'екта гаспадарання, бізнесмен, прадпрымальнік лічыць свае грошы і працаваць будзе там, дзе выгадна, прыбыткова. Але я заўсёды настойваю на тым, каб як мага менш аптымізавалася гандлёвая сетка, каб менш закрывалася стацыянарных аб'ектаў гандлю. Мы бачым: закрыўся стацыянарны аб'ект — дзіцячы садок, школа, крама, стала горш для людзей, — лічыць **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ.** — Менавіта крама — месца зносін, сустрэч жыхароў, дзе яны, робячы пакупкі, могуць пагутарыць, абмеркаваць мясцовыя навіны.

Наталля Віктараўна шмат ездзіць па вобласці, сустракаецца з людзьмі. І калі яны скардзяцца на тое, што закрылі або збіраюцца закрыць краму, настойліва звяртаецца да кіраўнікоў спажыўкааперацыі, каб яны па магчымасці захавалі аб'ект. Маўляў, хто працуе, хто атрымлівае пенсію, той мае права распараджацца грашыма так, як лічыць патрэбным.

— Мы не павінны людзей у нечым абмяжоўваць, прапаноўваць асартыментны пералік, які, на наш погляд, дастатковы для сельскага жыхара. Чалавек прыйдзе і купіць тое, што яму неабходна, — кажа Наталля Якубіцкая.

Менавіта на ўдасканаленне гандлёвага абслугоўвання, пашырэнне гандлёвай сеткі ў сельскай мясцовасці і накіраваны Указ Прэзідэнта № 345 ад 22 верасня 2017 года «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання». Гэты дакумент прадугледжвае стварэнне спрыяльных умоў для арганізацыі і вядзення бізнесу. Ён дакладна прапісвае, што дзеянне льгот распаўсюджваецца на населеныя пункты і тэрыторыі па-за населенымі пунктамі, якія вызначаюцца рашэннямі абласных Саветаў дэпутатаў.

У Мінскай вобласці праведзена значная работа па вызначэнні населеных пунктаў і тэрыторый, якія падпадаюць пад дзеянне ўказа. Пасля ўступлення ў сілу апошняга было прапанавана распаўсюдзіць прадугледжаныя дакументам ільготы на шэраг тэрыторый і населеных пунктаў Пухавіцкага і Барысаўскага раёнаў. Дэпутаты аднагалосна падтрымалі сфарміраваны пералік. Такім чынам, індывідуальныя прадпрымальнікі і асобныя катэгорыі юрыдычных асоб, якія ажыццяўляюць тут сваю дзейнасць, з 1 студзеня 2018 года змаглі скарыстацца льготамі і прэферэнцыямі. А яны даволі істотныя. Гэта льготы па зямельным падатку, падатку на нерухомасць юрыдычных асоб, падаходным падатку, адзіным падатку, падатку на дабаўленую вартасць, па арэндзе.

Аналіз вынікаў работы за гэты перыяд паказаў, што ў мясцовым гандлі, грамадскім харчаванні ёсць зрухі да лепшага, у тым ліку створаны новыя рабочыя месцы. Рашэннем Мінскага абласнога Савета дэпутатаў ад 23 лістапада 2017 года спіс быў дапоўнены за кошт населеных пунктаў і тэрыторый іншых раёнаў вобласці, на якія распаўсюджваецца дзеянне прадугледжаных указам ільгот для арганізацый гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва.

— У Мінскім аблвыканкаме пастаянна праводзіцца работа па пашырэнні адпаведнага спісу населеных пунктаў і тэрыторый. Так, рашэннем Мінскага абласнога Савета дэпутатаў ад 13 лістапада 2020 года ў пералік унесены змяненні і ўключаны 4706 сельскіх населеных пунктаў (90,8 % ад агульнай колькасці), 88 тэрыторый па-за населенымі пунктамі, тры населеныя пункты, што адносяцца да тэрыторыі малых гарадскіх паселішчаў, на якія распаўсюджваецца дзеянне льгот, прадугледжаных указам, — расказала **начальнік аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінаблвыканкама Алена ЧАБАТАР.** Па словах Алены Віталеўны, адзін суб'ект гаспадарання — сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Агракамбінат «Сноў» — скарыстаўся правам ажыццяўлення рознічнага гандлю, доля якога ў аб'ёме рознічнага тавараабароту харчовых тавараў перавысіла 20 % на тэрыторыі Нясвіжскага раёна, у гандлёвых аб'ектах, размешчаных у сельскіх населеных пунктах Нясвіжскага раёна, уключаных у пералік.

У межах указа каля 70 суб'ектаў гаспадарання пачало дзейнасць больш як у 220 рознічных гандлёвых аб'ектах. Райвыканкамамі ўзгоднена больш за 400 маршрутаў руху аўтамагазінаў і асартыментнага пераліку тавараў для іх.

— Спіс, які зацвярджалі год таму, мы пашырылі. Калі раней прывязваліся да градацыі населеных пунктаў, колькасці жыхароў у іх, то цяпер разам з галоўным упраўленнем гандлю і паслуг падышлі да справы па-іншаму, — дадае Наталля Якубіцкая. — Былі сабраны ўсе прапановы з раёнаў. Намеснікі старшынь райвыканкамаў, якія курыруюць эканоміку, прапрацоўвалі гэтыя пытанні са старшынямі сельвыканкамаў, насельніцтвам, зацікаўленымі службамі. І ўсе пажаданні, дзе ёсць неабходнасць уключэння населенага пункта ў спіс, мы ўлічылі. Якія асноўныя крытэрыі? Гэта закрыццё аб'екта спажывецкай кааперацыі, яго адсутнасць, неэфектыўная работа, недастатковы асартымент тавараў. Мы вывучылі ўсе пажаданні людзей і пайшлі ім насустрач. Калі ласка, адкрывайце, працуйце. Хай гэта будзе сеткавая, фірменная крама або якая іншая. Указ Прэзідэнта скіраваны на тое, каб не закрываць аб'екты гандлю, а развіваць і ўдасканальваць сістэму.

Дарэчы, цяпер неабходны мінімум тавараў у сельскай мясцовасці прапаноўваюць паштовыя аддзяленні, і з кожным годам асартыментны пералік павялічваецца. У вёску ездзяць аўталаўкі, дзе можна нават заказаць неабходныя прадукты і ў наступны раз іх абавязкова прывязуць. Аднак, як лічыць Наталля Якубіцкая, стацыянарнай крамы нішто не можа замяніць. На першым плане павінен быць клопат аб чалавеку, яго патрэбах.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Аўтакрама — добра, але стацыянарную яна не заменіць.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




СЛОВА — ДЭЛЕГАТУ

**Сенатар Кацярына СЕРАФІНОВІЧ:**

# «VI Усебеларускі народны сход не будзе юбілейным па ліку, але стане гістарычным па сэнсе»



— Многае ўжо сказана пра Усебеларускі народны сход і яго дэлегатамі, і тымі, хто не зычыць краіне і яе народу дабра, спрабуючы зрабіць так, каб сход не адбыўся. Дарэмныя гэтыя старанні ндобразычліўцаў — шосты па ліку Усебеларускі народны сход пройдзе 11—12 лютага, і гэта будзе, я ўпэўнена, адна з найбольш важных падзей не толькі бягучага года, але і ў цэлым пяцігодкі. Гэта будзе мерапрыемства, на якім вызначацца грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя кірункі жыцця краіны на найбліжэйшую і больш аддаленую перспектывы.

Якімі яны будуць, цікава многім. У складзе прадстаўнікоў рэгіянальных СМІ мне давялося прысутнічаць на прэзентацыі праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады. Палажэнні Праграмы былі дэталёва разгледжаны і на абласным сходзе дэлегатаў Гродзенскай вобласці, акцэнт быў зроблены на развіцці Панямонскага краю.

Наогул праект Праграмы ўражвае — у ім так граматна спалучыліся кірункі, нацэленыя на развіццё прамысловага комплексу, высокатэхналагічных вытворчасцяў, і разам з тым асноўныя шляхі да сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў новай пяцігодцы, умацаванне інстытута сям'і, садзейнічанне занятасці, дастойная аплата працы, актыўнае даўгалецце... Вельмі шмат увагі ўдзелена непасрэдна клопату аб чалавеку, аб кожным жыхару краіны... Важна, каб усе грамадзяне Беларусі, нашы землякі азнаёміліся з праектам Праграмы, якая будзе абмяркоўвацца на ўсенародным форуме. Для гэтага на старонках «Лідскай газеты», на яе сайце, у сацыяльных сетках размешчаны палажэнні Праграмы.

Упэўнена, сваё слова скажуць дэлегаты сходу. А гэта людзі, якія не толькі вызначыліся ў жыцці з прафесіяй і дасягнулі ў ёй значных поспехаў, але і маюць актыўную грамадзянскую пазіцыю, працуюць на ўсеагульную карысць. Такіх патрыётаў краіны я часта сустракаю сярод сваіх калег, сярод тых лідчан, з кім даводзіцца мець зносіны па рабоце, і, безумоўна, у Савеце Рэспублікі.

Адданыя сваёй сям'і, справе, Радзіме людзі маюць права і магчымасць сказаць сваё слова пры вырашэнні будучыні краіны. У Год народнага адзінства мы ўсе, незалежна ад сацыяльнага статусу, палітычных поглядаў, павінны згуртавацца вакол самых важных для нас каштоўнасцяў і дбаць пра мір і згоду ў нашым агульным доме — Беларусі.




# БОЛЬШ ПАЎНАМОЦТВАЎ СТАРЭЙШЫНАМ!

## Якія змены прапаноўваюцца з Віцебшчыны?

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ падзяліўся з карэспандэнтам «МС» вынікамі дзейнасці грамадскіх прыёмных і дыялогавых пляцовак. Усе прапановы і заўвагі, а іх некалькі сотняў, пільна вывучаны, найбольш тыповыя, актуальныя перададзены ў арганізацыйны камітэт VI Усебеларускага народнага сходу.**

Суразмоўнік канстатаваў, што «прыёмныя» наведала больш 300 чалавек. Усіх уважліва выслухалі, узялі «на аловак» заўвагі і прапановы.

Уладзімір Цярэнцьеў лічыць практыку правядзення дыялогавых пляцовак вельмі цікавай. Зразумела, што ў канфліктах і супрацьстаяннях немагчыма вырашаць праблемы. Толькі падчас абмеркавання ёсць шанц вызначыць шляхі іх рашэння.

— Такі фармат зносін дазволіў весці канструктыўны дыялог, канкрэтызаваць актуальныя пытанні, сфарміраваць стратэгічныя прыярытэты на найбліжэйшую і доўгатэрміновую перспектывы, — падкрэсліў спікер «абласнога парламента».



У гэтых мерапрыемствах бралі ўдзел прадстаўнікі не толькі праўладных, але і апазіцыйных партый, грамадскіх арганізацый, актывісты. І кожны мог выказаць сваю думку, аргументаваць свой погляд на тое, што адбываецца ў населеным пункце, краіне і якія патрэбныя змены, каб паміж людзьмі з рознымі палітычнымі поглядамі было паразуменне.

Дарэчы, падчас такіх пасяджэнняў сярод іншага былі агучаны чаканні і прапановы наконт актывізацыі ўдзелу партый у развіцці грамадства. Што датычыцца дэпутацкага корпуса, прапаноўвалася скасаваць практыку абрання дэпутатаў сельскіх Саветаў. Гэтыя людзі вельмі загружаныя па рабоце, і ім проста фізічна не хапае часу і сіл выконваць адказную грамадскую нагрузку.

Пры тым вельмі часта згадвалася неабходнасць павысіць статус старэйшын (у іншых абласцях іх называюць старастамі). Іх прапануецца надзяліць параўнальна большымі ўладнымі паўнамоцтвамі. Гэтыя актывісты добра ведаюць усё, што адбываецца ў населеных пунктах, карыстаюцца аўтарытэтам. Адпаведна, могуць згуртаваць грамадзян на добраўпарадкаванне і г. д. Старэйшыны па-ранейшаму будуць своечасова інфармаваць уладу, калі ёсць нейкія цяжкасці, праблемы, якія немагчыма вырашыць самастойна, і таму неабходна дапамога з боку раённай улады.

Што датычыцца фінансавай зацікаўленасці старэйшын на новым узроўні іх паўнамоцтваў, неабходна будзе яшчэ вырашыць гэтае пытанне.

Ёсць думкі наконт неабходнасці рэфармавання сістэмы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак. Аўтары прапаноў лічаць, што на тэрыторыі кожнай павінна пражываць не менш як 2000 чалавек. Пры такім раскладзе на Віцебшчыне застанецца 46 згаданых вышэй адзінак з выканкамамі, Саветамі і дэпутатамі. Астатнія 150 пяройдуць у разрад тэрытарыяльных адзінак з сельскімі адміністрацыямі.

Выказвалася ідэя наконт пераводу дзейнасці абласнога Савета дэпутатаў на прафесійную аснову, павелічэння тэрміну дэпутацкіх паўнамоцтваў на ўсіх узроўнях, у тым ліку і ў парламенце, да пяці гадоў.

Сярод іншых прапаноў — роўныя ўмовы гаспадарання для прадпрыемстваў і арганізацый, незалежна ад формы ўласнасці, у прыватнасці пры крэдытаванні і правядзенні праверак.

А можа наспеў час для таго, каб з'явілася пасада ўпаўнаважанага па правах чалавека?

Выступаючы перад дэлегатамі VI Усебеларускага народнага сходу, Уладзімір Цярэнцьеў нагадаў, што Прэзідэнт быў ініцыятарам шырага дыялогу ў грамадстве. І само жыццё пацвярджае запатрабаванасць такога фармату ўзаемадзеяння.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

СЛОВА — ДЭЛЕГАТУ

**Сенатар Сяргей АНЮХОЎСКІ:**

# «ПАВІННА БЫЦЬ ПРАВА НА КАМЕРЦЫЙНУЮ РЫЗЫКУ»



**Бабруйскае ААТ «Чырвоны харчавік» — адно з сучасных інавацыйных прадпрыемстваў краіны. Летась на створаным ім у рамках праграмы развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці філіяле ў Слаўгарадзе адбыўся запуск новай лініі па разліве мёду. У хуткім часе тут плануецца распачаць выпуск кандытарскіх вырабаў і мармеладу і ствараць 100 рабочых месцаў. Для Слаўгарада, невялічкага райцэнтра, дзе амаль няма буйной вытворчасці, гэта новыя магчымасці для развіцця, занятасці насельніцтва, росту яго дабрабыту. Для дырэктара прадпрыемства Сяргея Анюхоўскага гэта вельмі важна, бо ён яшчэ і сенатар, а значыць, жыве клопатамі не толькі свайго працоўнага калектыву, але і жыхароў Бабруйска, Асіповіч і Слаўгарада. Яму неабыякава, які будзе заўтрашні дзень, і ёсць разуменне таго, што трэба змяніць да лепшага, каб краіна ўмацавала сваю эканамічную бяспеку. Свае думкі ён збіраецца агучыць на VI Усебеларускім народным сходзе.**

— І я, і працоўны калектыў ААТ «Чырвоны харчавік» з цікавасцю назіраем за падрыхтоўкай да VI Усебеларускага народнага сходу, — кажа дэлегат. — Як кіраўнік буйнога прадпрыемства са 150-гадовай гісторыяй, магу аўтарытэтна заявіць, што кансалідацыя і паступальны рух наперад — гэта залог стабільнасці. Нашу прадукцыю ведаюць больш чым у 25 краінах свету. Зладжаная работа, заснаваная на пастаяннай механізацыі, абнаўленні і ўкараненні інавацый, гэта заўсёды поспех і, як вынік, дастойная заробатная плата. Пераемнасць у калектыве дазваляе забяспечыць устойлівасць да знешніх і ўнутраных пагроз. Сёлета заканчваецца этап мадэрнізацыі фабрыкі праз стварэнне дадатковых магутнасцяў па вытворчасці кандытарскіх вырабаў і мармеладу ў Слаўгарадзе — раёне, які ўваходзіць у паўднёва-ўсходні рэгіён Магілёўскай вобласці. Дзеючы Указ Прэзідэнта і падтрымка фінансаваня аблвыканкамам і канцэрнам «Белхарчпрам» стварылі ўмовы для арганізацыі інавацыйнай вытворчасці. Яна дазволіць памяншыць імпарт у краіну кандытарскіх вырабаў і павялічыць глыбіню перапрацоўкі мясцовай пладова-ягаднай сыравіны і мёду, палепшыць якасць харчавання беларусаў, пашырыць геаграфію экспарту. Да канца года ў Слаўгарадзе будзе створана больш за сто рабочых месцаў з годным заробкам.

Падчас сустрэч з калегамі на дыялогавых пляцоўках прагаворваліся пытанні, ад вырашэння якіх залежыць развіццё многіх галін нашай краіны. Выпрабаванне каранавірусам паказала неабароненасць беларускага вытворцы. Знешнія рынкі былі сур'ёзна арыентаваныя на сваіх вытворцаў. Гэта, дарэчы, вельмі правільна, бо падаткі і даходы ад вытворчасці ў такім выпадку застаюцца ў краіне.

Сёння назіраецца прыток танных імпартных прадуктаў харчавання, якасць якіх часта ніжэйшая, чым у айчынных. Мы прывыкаем да паняццяў «транстлушчы», «пальмавае масла», якія не так даўно яшчэ былі нам незнаёмыя. Надышоў час стварыць органы або пашырыць дзейнасць існуючых, каб засцерагаць нашых грамадзян ад нізкаякаснага харчавання. Мы павінны забяспечыць высокую якасць прадуктаў як адзін з фактараў росту працягласці жыцця. У еўрапейскіх краінах, а таксама ў Кітаі, Японіі, сертыфікацыя імпартных тавараў ажыццяўляецца па ўласных нацыянальных стандартах якасці. Імпарт павінен быць вельмі якасны і бяспечны. Дактрына нацыянальнай прадуктовай бяспекі прадугледжвае долю айчыннага вытворцы не менш чым 85 %. Сёння гэта лічба па прадуктах харчавання ў нашай краіне крыху больш чым 77 %. Павінна быць жорсткае патрабаванне да крытэрыяў: не выконваеш палажэнні дактрыны — плаціш павышаныя плацяжы за зямлю пры будаўніцтве, эксплуатацыі гандлёвага аб'екта, каб звышдаходы ад імпарту заставаліся ў мясцовым бюджэце. Расход валютных сродкаў на някрытычны імпарт таксама лічу недапушчальным. Калі імпарцёр траціць валюту, умоўна кажучы, ад продажу цукру на цукеркі, або ад продажу малака на ёгурты — гэта нелагічна. Як варыянт, магчымы продаж валюты іншым імпарцёрам па курсе з камісіяй. Даходы ад продажу валюты з камісіяй акумулююцца ў Беларусі і накіроўваюцца на інавацыйныя праекты.

Яшчэ адно важнае пытанне — гэта дзеючае заканадаўства ў сферы будаўніцтва. За апошнюю пяцігодку шмат зроблена па дэталізацыі заканадаўства будаўніцтва, але як кіраўнік прадпрыемства, які рэалізуе інвестыцыйны праект, лічу, што неабходна працягнуць работу па спрашчэнні ўкаранення інавацый і прыцягненні інвестыцый. Бяспека грамадзяніна, безумоўна, галоўны прыярытэт. Важна, каб будучы праект быў эфектыўны. Залішнія выдаткі павялічваюць тэрміны ўвядзення аб'екта і яго акупнасці. І яшчэ адзін важны момант — павінна быць права на камерцыйную рызыку. На дыялогавых пляцоўках гэта пытанне абмяркоўвалася і яно вельмі актуальнае для многіх кіраўнікоў. Скажу адкрыта, што на прадпрыемстве не заўсёды ўсё атрымліваецца, як запланавана. Памылкі не выключаны. Але, баючыся зрабіць памылку, у выніку можна наогул нічога не зрабіць. Нездарма кажуць, што ніколі не памыляецца толькі той, хто нічога не робіць. Са свайго боку хачу запэўніць, што кіраўніцтва і працоўны калектыў «Чырвонага харчавіка» забяспечаць далейшае развіццё сучаснай інавацыйнай вытворчасці, якая будзе садзейнічаць росту дабрабыту людзей і выкананню Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны на будучую пяцігодку.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 4 лютага 2021 года.

# ТОЙ, ХТО РАЗМАРОЗІЦЬ ДУШУ

## Што яднае Рэчыцу і Крайнюю Поўнач?

**На Гомельшчыне ў пачатку новага культурнага года — «фотакатарсіс». Работы ашаламляльнай прыгажосці і шчырасці душы, якія яднаюць беларускае Палессе і паўночную частку паўвострава Камчатка. Прадстаўленыя ўнікальныя здымкі — гэта не толькі «пра мастацтва», а яшчэ і гісторыя лёсу незвычайнага чалавека, ураджэнца Рэчыцы Аляксандра КЛЮЧНІКАВА.**




Фотамастак, музыкант, даследчык, а яшчэ беларускі «нафтавік». Ён нарадзіўся ў Рэчыцы ў 1947-м, з дзяцінства захапляўся музыкай. Скончыў музычную школу, пасля — вучылішча імя Сакалоўскага. Выкладаў у музшколе ў Рэчыцы, быў канцэртмайстрам ансамбля танца «Дняпро», удзельнікам мясцовага вакальна-інструментальнага ансамбля. У 1972 годзе разам з жонкай Нэлі вырашаецца на кардынальныя змены: яго вабяць прыгоды ўдалечыні ад родных мясцін, цягне на Поўнач неабсяжнага СССР. Так, даслаўшы лісты ў некалькі месцаў, Ключнікавы атрымалі першае запрашэнне на Камчатку. Новым домам для маладой беларускай сям'і стаў гарадок у Каракскай акрузе.

Аляксандр працаваў у школе мастацтваў і Доме культуры, стварыў вакальна-інструментальны ансамбль. У складзе культагітбрыгад часта наведваў паселішчы аленяводаў у самых аддаленых кутках паўночнага краю. Ён здымаў на плёнку ўнікальныя кадры аб жыцці каракаў, чукчаў, ітэльменаў, эвенаў... На фота і відэахроніках — побыт, прырода, традыцыі паўночных народаў. Ён умеў убачыць і зафіксаваць тое, што іншым здавалася звычайным. Фотамастак заваяваў асаблівы давер: яму дазвалялася здымаць тое, што ад іншых хавалася.

Захапленне фатаграфіяй неўзабаве перарасло ў работу. Аляксандр Уладзіміравіч — аўтар унікальных дакументальных відэафільмаў, якія дэманстраваліся на шматлікіх выстаўках. Яны расказваюць аб самабытных мастаках, таленавітых настаўніках, стваральніках нацыянальнага адзення.

Пасля 14 гадоў жыцця на Камчатцы Аляксандр Ключнікаў з сям'ёй вярнуўся назад у Беларусь.

— Прыехалі ў Рэчыцу ў 1985 годзе, пачалі ўсё







з чыстага ліста, — згадвае жонка фотамастака Нэлі Сяргееўна. — Я пайшла працаваць у мясцовы музей, Саша — на завод «Рытм», хоць шукаў работу па спецыяльнасці. Аднак гэта на Поўначы Ключнікава ведалі як таленавітага фатографа, тут для мясцовых ён быў нікім. І ўсведамленне гэтага давалася нялёгка. Да таго ж на Камчатцы ён як карэспандэнт прывык да свабоднага графіка. Тое, што яму тут дрэнна, я разумела і па яго фатаграфіях. Другое дыханне ў Сашы адкрылася, калі ён уладкаваўся працаваць на «Беларуснафту». З 1986 года працаваў з нашымі нафтавікамі ў Заходняй Сібіры. Тады ён літаральна ажыў.

У 80-90-я гады мінулага стагоддзя выдатныя фатаграфіі Ключнікава, пазаштатнага аўтара газеты «Нафтавік», публікаваліся не толькі ў карпаратыўным выданні, але і ў многіх іншых. Сярод іх — «Звязда», «Знамя юности», «Правда». Серыя фатаграфій «Мінус 49 градусаў», зробленая на радовішчы Нагодняе ў 1987 годзе, абляцела краіну. Работы фотамастака таксама сталі ілюстрацыямі да кнігі «Нафтавая жамчужына Беларусі», а здымкі, зробленыя на радовішчах, сёння — увогуле фоталетапісы нафтаздабычы ў Заходняй Сібіры.

— Работу ў экспедыцыі глыбокага эксплуатацыйнага свідравання ў Заходняй Сібіры, ён спалучаў са сваім хобі — фатаграфіяй. На яго здымках адлюстравана прыгажосць Крайняй Поўначы, народнасцяў, якія пражываюць у гэтых шыротах, і, вядома, працоўныя будні нафтавікоў ва ўмовах суровага клімату. Аляксандр Ключнік пакінуў багатую спадчыну ў выглядзе фотаздымкаў, слайдаў, апісальных дзённікаў. Гэта вялікая каштоўнасць для нашага прадпрыемства, — падкрэслівае старшыня Савета ветэранаў ВА «Беларуснафта» Уладзімір Гошкіс.

Нягледзячы на тую адлегласць, якую фотамастак знайшоў у Сібіры, як успамінае яго ўдава, Аляксандра Уладзіміравіча не пакідала думка аб вяртанні на Камчатку, у Каракскую акругу. Ён неаднойчы ўгаворваў Нэлі Сяргееўну зноў паехаць на Поўнач. Сышліся на тым, што галава сям'і паедзе адзін...

— Вярнуўшыся на Камчатку, ён зноў здымаў. Браў апаратуру, заплечнік і ляцеў па новыя гісторыі. У нейкі момант алічбаваў усе свае работы, прывёў у парадак архіў, быццам адчуваў, што хутка сыдзе, — разважае Нэлі Сяргееўна.







У 2009 годзе Аляксандра Уладзіміравіча Ключнікава не стала. Але памяць аб ім жыве не толькі ў сэрцах родных і блізкіх, калег і знаёмых. Ён працягвае жыць і ў сваіх творах. За апошнія гады на Камчатцы былі выпушчаны два фотаальбомы, прысвечаныя творчасці беларуса. Цяпер плануецца трэці.




На Гомельшчыне выстаўку ўнікальных работ фотамастака арганізавалі прадпрыемства «Беларуснафта» і Музей гісторыі горада Гомеля. Экспазіцыя «Ключнікаў. Вяртанне» адкрыта да 12 лютага. Гэта 40 работ аўтара, сярод якіх як знакамітыя фотасюжэты, так і тыя, якія раней нідзе не дэманстраваліся. Ёсць і ўнікальныя чорна-белыя кадры, надрукаваныя самім майстрам.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ІРАН ЦІКАВІЦЬ УСІХ!..

**На адкрыццё выстаўкі «Іран — каштоўная зямля», якая днямі адкрылася ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», нягледзячы на пандэмію, прыйшло нямала гасцей. Літаральна не было дзе яблыку ўпасці.**

